Літаратурная Беларусь

Выпуск №3 (91)
(сакавік)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas. info

Змест



Гліна і цэгла



Алег АБЛАЖЭЙ,

Беларускае Радыё Рацыя

«Это Америка везде свой нос суёт!» — азызлы лысы дзядзька ў аўтобусе тлумачыць палітычную сітуацыю гэткім жа разлезлым і бітым жыццём пенсіянеркам. Гучна, упэўнена.

Такіх у маім віленскім суседстве нямала. Яны дагэтуль называюць Кальварыйскую вуліцу «Дзяржынкай», многія да нядаўняга часу ўпарта называлі літы рублямі. А колісь, у 90-я, пачуўшы летувіскую мову, якой яны прынцыпова не вывучалі, шыпелі — «фашысты»!

Прадукт расійскіх тэлеканалаў. Падатлівая гліна для крамлёўскіх прапагандыстаў. Для іх усе, хто ў Летуве гаворыць па-летувіску, у Беларусі — па-беларуску, і г.д. — «фашысты» і «нацыяналісты».

Малойчыкі, якія маршыруюць у чорнай форме па Маскве з мадыфікаванай свастыкай, «коловратом», равучы «Зіг хайль!», не фашысты. Патрыёты.

«Ты слышал, что творят бандеровцы в Киеве?» — пытае сусед. Стараюся трымацца ад яго далей — з мылам і мачалкай гэты ягамосць яўна не сябруе.

«А ты ведаеш, хто такі быў Сцяпан Бандэра, чаго ён хацеў?» Маўчыць. Таксама ахвяра РТР ды іншых, так і хочацца сказаць, — не каналаў, а каналізацыі.

Сёння гэтая ліпкая гліна дачакалася свайго зорнага часу ў Крыме і ўсходніх абласцях Украіны. Зрываюць украінскія сцягі, скандуюць — «Путин! Россия!» І палююць на «бандэраўцаў», якія існуюць толькі ў іхняй распаленай фантазіі. У Крыме вітаюць «абаронцаў», узброеных да зубоў.

Лгарства перайшло ўсе магчымыя межы. Вось на радыё істэрычна енчыць нейкі дэпутат Дзяржлумы — «Украіну акупавалі нямецка-амерыканскія інтэрвенты! Толькі Крым нам удалося адстаяць!» Што там той дэпутат. Шчыра гледзячы ў тэлекамеру, сам Галоўнакамандуючы, Прэзідэнт усё яшчэ вялікай краіны, нахабна маніць: «У Крыме няма расійскіх войскаў. Гэта мясцовая самаабарона! А вайсковы камуфляж можа хто заўгодна купіць». Ага, аўтаматы і гранатамёты таксама можна прыдбаць на любым крымскім кірмашыку.

Інтанацыі мне добра знаёмыя. Так у свой час гэбэшны «кум» пераконваў мяне, што ніякіх сакрэтных пратаколаў пры дамове Молатава — Рыбентропа ніколі не існавала...

Тыя, хто вітаў «вызваляльнікаў», ці не пачнуць плявацца ў іх бок? Крымскія авантуры заўсёды выходзілі для Расіі бокам. Так будзе і на гэты раз

Народ Украіны таксама да нядаўняга часу быў глінай, калі прагаласаваў за дробнага крымінальніка. Толькі вогнішча Майдану абпаліла яго да стану цвёрдай цэглы. Можна паспрабаваць раскалоць, але вылепіць нічога не ўдасца.

Тыя, што шалеюць на вуліцах Данецка, Харкава і Луганска, размахваючы расійскімі трыкалорамі, гэтаксама, як і іхні кумір Пуцін, жывуць катэгорыямі ўчарашняга дня і не ў стане зазірнуць у бліжэйшую будучыню. Намагацца стаць часткаю Расіі ў наш час — раўнасільна купіць білет на «Тытанік». Бо гэта краіна — калос на гліняных нагах.

У наш час усё вызначаюць перадавыя тэхналогіі. Што можа Расія апроч узбраення і космасу (ды й тут не на першым ужо месцы!)? Ані аўтамабіль талковы зрабіць (дзе тыя Лады-Каліны, што рэкламаваў сам Пуцін?), ані мабільнік ці тэлевізар, ужо не кажучы пра камп'ютары. Нічо-га. Цікава, напрыклад, — сам Пуцін голіцца траскучым «Бердскам» ці машынкай «Філіпс?» І гэтая краіна спрабуе супроцьпаставіць сябе ўсяму цывілізаванаму свету? Уся яе «моц» грунтуецца на нафтагазавай трубе. Але нафта — сыравіна ўчарашняга дня. Няўжо Пуціну не паведамілі памочнікі, што вядучыя аўтамабільныя канцэрны ўжо ставяць у серыйную вытворчасць аўтамабілі з вадароднымі, электрычнымі рухавікамі? А французы сканструявалі легкавік, які працуе на сціснутым паветры.

Газ? Дык залежы сланцавага газу адкрыты не толькі ў ЗША, а і ў Польшчы, Украіне, нават у Летуве. Не трэба быць Вангай ці гадалкай на кававай гушчы, каб прадказаць: пры сучасным імклівым развіцці тэхналогій гэтак жа хутка будзе змяншацца роля нафты і газу ў перадавых эканоміках. І хамскія непрадказальныя паводзіны Крамля толькі паскараюць гэты працэс. А без нафтадаляраў і газавых даходаў эканоміка Расіі з яе дапатопнымі тэхналогіямі і вечна п'янымі рабацягамі ляснецца як картачны домік. І чым тады карміць Асецію, Абхазію і той жа Крым — калі ўдасца яго адарваць ад Украіны?

Зрэшты, ацвярэзенне крымчакоў наступіць неўзабаве — калі туды не паедуць турысты і курортнікі, калі не адзіная, то галоўная крыніца даходаў мясцовага насельніцтва. І тыя, хто вітаў «вызваляльнікаў», ці не пачнуць плявацца ў іх бок?

Крымскія авантуры заўсёды выходзілі для Расіі бокам.

Так будзе і на гэты раз.

Беларускія правы

Дзярждэпартамент ЗША апублікаваў справаздачу аб правах чалавека ў свеце. Беларусь у дакладзе называецца аўтарытарнай дзяржавай, дзе стала парушаюцца правы чалавека. Прадставіў даклад журналістам дзяржсакратар ЗША Джон Кэры.

У дакладзе сцвярджаецца, што ўсе прэзідэнцкія выбары, якія праводзіліся пасля 1994 года, у тым ліку выбары прэзідэнта 2010 года, не былі ні свабоднымі, ні справядлівымі.

Сярод іншых парушэнняў правоў чалавека называюцца зняволенне людзей паводле палітычных матываў, у тым ліку за крытыку чыноўнікаў і ўдзел у дэманстрацыях, злоўжыванні з боку сілаў бяспекі, якія збівалі людзей падчас затрыманняў дэманстрантаў, катаванні і жорсткае абыходжанне ў турмах.

Улады Беларусі, паводле амерыканскага Дзярждэпа, пераследуюць праваабарончыя групы, палітычныя партыі, няўрадавыя арганізацыі (НДА), адмаўляюць ім у рэгістрацыі, а пасля прыцягваюць да адказнасці за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі.

Таксама ў дакладзе сцвярджаецца, што ў Беларусі маюць месца факты дыскрымінацыі тых, хто імкнецца выкарыстоўваць у грамадскай сферы беларускую мову.

Акрамя таго, як сцвярджаецца ў дакладзе, урад Беларусі абмяжоўвае дзейнасць незалежнага Саюза беларускіх пісьменнікаў і шырока падтрымлівае праўладны Саюз пісьменнікаў. Улады таксама пераследавалі распаўсюджвальнікаў кніг, аўтарамі якіх з'яўляюцца крытычныя і незалежныя пісьменнікі, а таксама кніг на беларускай мове.

Паводле Радыё Свабода



Развітанне

На пачатку сакавіка на адрас Саюза беларускіх пісьменнікаў з розных куткоў свету з прычыны смерці народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна прыйшлі дзясяткі спачуванняў. Сярод іншых — ад пасла Беларусі ў Францыі Паўла Латушкі, старшыні Саюза пісьменнікаў Швецыі Гунара Ардэліуса, былога пасла Славакіі ў Беларусі Любаміра Рэгака, дырэктара беларускай службы «Радыё Свабода» Аляксандра Лукашука.

Сёння «ЛБ» публікуе слова на Імшы развітання з нацыянальным геніем прадстаўніка Папы Рымскага Апостальскага Нунцыя ў Беларусі арцыбіскупа Клаўдыё Гуджэроцці.

Слова Апостальскага Нунцыя Ватыкана ў Беларусі Клаўдыё Гуджэроцці

У той момант, калі Касцёл аддае апошнюю зямную пашану вялікаму паэту, давяраючы яго міласэрнай любові Бога, прагну і я маліцца разам з вамі.

Глыбокае і тонкае мастацтва Рыгора Барадуліна — гэта голас маўклівай душы беларускага народа. У ім паэзія і духоўнасць яднаюцца ў моцных абдымках. Таму нерухомае маўчанне ягонага нежывога цела можна ўспрымаць як апошні жэст творчасці гэтага хрысціяніна і паэта.

Мова — гэта інструмент, якім карыстаецца Бог, каб размаўляць з народам. Таму яна святая і вартая, каб яе шанавалі і любілі, як маці. На гэтым інструменце Рыгор Барадулін умеў выконваць дзівосныя мелодыі і дазволіў беларускаму народу сваёй мовай дакрануцца да вышынь прыгажосці.

Барадулін хацеў таксама, каб шляхетныя паэты іншых культур маглі паўтарыць свае спевы на беларускай мове. Разам з іншымі незвычайнымі аўтарамі ён прычыніўся да перакладу «Рымскага Трыпціха» Яна Паўла II, якога крыху больш чым праз месяц Каталіцкі Касцёл абвесціць святым.

Веру, што беларусы, якія разам з іншымі святымі жывуць у ззянні Божага святла, выйдуць яму насустрач, каб падвесці яго да Бога. І, быць можа, Бог прывітае яго ў сваім доме простымі словамі, якімі беларускае сэрца вітае гасцей: «Калі ласка, Рыгор».

Дарагія беларусы, любіце вашых мастакоў — вялікіх і шматлікіх. Яны вучаць вас узднімаць свае вочы ўгору, да Бога надзеі, да жыватворнага сонца, якое ззяе ў вашым вечна прывабным небе, абуджаючы ў вас сілы да штодзённага ўваскрасення.

Божа, благаславі Беларусь і яе народ, з яго даверлівай мовай і пяшчотнымі спевамі!

ПАЛІЦА

Мастак украінскай нацыі

Да 200-годдзя з дня нараджэння Тараса Шаўчэнкі Саюз беларускіх пісьменнікаў выдаў кнігу твораў украінскага класіка ў перакладзе на беларускую мову — пад назвай «Мастак».

Юбілейны том выйшаў у выдавецтве «Кнігазбор». Кніга выдадзена дзякуючы спрыянню Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Украіны ў Рэспубліцы Беларусь Міхаіла Ежэля і Ганаровага Консула Украіны ў Гродне Валянціна Байко. І — укладальніка выдання, нястомнага перакладчыка і папулярызатара творчасці ўкраінскага Кабзара — Валера Стралко.

Першы раздзел кнігі «На вечным шляху да Шаўчэнкі» (аб'ёмная прадмова, напісаная Іванам Дзюбам і Міколам Жулінскім, акадэмікамі Нацыянальнай акадэміі навук Украіны) прысвечаны апісанню і аналізу асноўных вехаў жыцця, творчасці і светапогляду Кабзара. Другі раздзел змяшчае паасобныя вершы Тараса Шаўчэнкі розных гадоў. У трэцім — адна з найлепшых апавесцяў класіка «Мастак». Завяршаюць кнігу пасляслоўе старшыні СБП Барыса Пятровіча і шэраг цытатаў з выказванняў вядомых сусветных творцаў і грамадскіх дзеячаў пра Тараса Шаўчэнку.

КРАСАВІЦКІЯ ЮБІЛЯРЫ

У наступным месяцы адзначаюць юбілеі сябры Саюза беларускіх пісьменнікаў:

11.04.1959 – Сяргей Аляксандравіч Астраўцоў
12.04.1959 – Аляксандр Уладзіміравіч Пятроў
20.04.1944 – Яўген Рыгоравіч Лецка


Жадаем усім радасці, натхнення і дабрабыту!



«Прачнуцца рунню па вясне...»:

Прэмія «Дэбют» імя Максіма Багдановіча

У мінскай галерэі «Ў» у чацвёрты раз уручалі літаратурную прэмію «Дэбют» імя Максіма Багдановіча, заснавальнікамі якой выступілі Саюз беларускіх пісьменнікаў і Беларускі ПЭН-цэнтр пры ўдзеле фундатара Паўла Бераговіча.



Сёлета ў намінацыі «Проза» ўганаравалі Кацярыну Оаро, у паэзіі — Уладзя Лянкевіча, у перакладзе — Кацярыну Мацiеўскую і Сяржа Мядзведзева. Спецпрэміяй адзначылі Дзмітрыя Дзмітрыева.

Вядучы цырымоніі — старшыня Беларускага ПЭН-цэнтра, літаратар, перакладчык Андрэй Хадановіч — адкрыў вечарыну чытаннем вершаў народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна, які адышоў у вечнасць 2 сакавіка. Прысутныя ўшанавалі памяць Рыгора Іванавіча хвілінай маўчання.

Успомніў вялікага паэта і Павел Бераговіч, відэазварот якога дэманстраваўся на экране.

Лявон Вольскі і Павел Аракелян выканалі песню «Белая яблыня грому» на верш дзядзькі Рыгора. Цягам вечара музыкі выходзілі да публікі некалькі разоў з рознымі, але аднолькава таленавітымі кампазіцыямі.

У склад журы, якое ацэньвала дэбютантаў, увайшлі вядомыя пісьменнікі, перакладчыкі, навукоўцы, грамадскія дзеячы: філосаф, эсэіст Валянцін Акудовіч, празаік Павел Анціпаў, пісьменнік Уладзімір Арлоў, перакладчык, кандыдат філалагічных навук Лявон Баршчэўскі, фундатар прэміі Павел Бераговіч, паэт, перакладчык, літаратурны крытык Марыя Мартысевіч, паэт, ганаровы старшыня Беларускага ПЭН-цэнтра Уладзімір Някляеў, пісьменнік, доктар філалагічных навук Алесь Пашкевіч, празаік, старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў Барыс Пятровіч, паэт, перакладчык, старшыня Беларускага ПЭН-цэнтра Андрэй Хадановіч і празаік, лаўрэат прэміі «Дэбют» 2011 года Наталка Харытанюк.

Сярод намінантаў у шорт-лісце апынуліся аўтары, кнігі якіх пабачылі свет у серыі «Пункт адліку» Бібліятэкі Саюза беларускіх пісьменнікаў. Напрыклад, у паэзіі ўсе тры кнігі маладых творцаў выйшлі пры падтрымцы СБП, у прозе — «Сарочае радыё» Кацярыны Оаро. «Саламея» Оскара Ўайлда ў перакладзе Кацярыны Мацiеўскай апублікаваная дзякуючы серыі «PostScriptum» часопіса «ПрайдзіСвет» таксама пры спрыянні Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Сёлета ў кароткі спіс патрапіла электронная кніга — аповесць Маргарыты Аляшкевіч, выдадзеная ў BYBOOKS, а таксама папяровыя выданні, якія выйшлі ў «Кнігазборы» і «Логвінаве».

Кожны з тых аўтараў, каму пашчасціла трапіць у шорт-ліст, меў магчымасць прачытаць на вечарыне фрагменты са сваіх твораў. За выняткам тых маладых літаратараў, хто па аб'ектыўных прычынах не мог прысутнічаць. Іх прадстаўлялі калегі, блізкія або сябры.

Замест грамадскага актывіста Змітра Дашкевіча, намінанта ў прозе, які на момант уганаравання знаходзіўся ў зняволенні, выступіла яго жонка Наста Дашкевіч. Старонкі з аповесці Кацярыны Оаро, якая цяпер жыве і працуе ў Францыі, агучыў Андрэй Хадановіч.

— Сябрам журы няпроста было прыняць рашэнне і выбраць лепшае з лепшага, усе намінанты будуць заахвочаныя, бо ўсе вартыя гэтага. У прозе ў лонг-лісце было 6 намінантаў, колькасць выдадзеных кніг расце, і гэта сведчыць пра перспектыўнасць прэміі імя Багдановіча, — адзначыў Барыс Пятровіч.

Усе намінанты атрымалі прызы ад арганізатараў. А выдавецтва «Логвінаў» паабяцала Маргарыце Аляшкевіч выдаць папяровую версію яе кнігі.

Перакладчыцу Ірыну Герасімовіч прадставіў Віталь Краўчанка (намінантка знаходзілася на кніжным кірмашы ў Лейпцыгу). Кацярына Мацiеўская зачытала маналог Саламеі з перастворанай ёй п'есы Оскара Ўайлда. Сяржук Мядзведзеў пераклаў на беларускую мову культавы твор Чака Паланюка «Байцоўскі клуб». Спадзяемся, у найбліжэйшы час прыхільнікі знанага амерыканца змогуць ацаніць яго тэксты на нашай роднай мове.

Лявон Баршчэўскі і Ганна Янкута абвясцілі лаўрэатаў у намінацыі «Пераклад» — Кацярыну Мацiеўскую і Сяржа Мядзведзева.

Другі год запар у паэзіі вырашылі ўручаць спецыяльную прэмію (нагадаем, летась яе атрымаў Глеб Лабадзенка за свой праект «Дзіцячая заМова»). Сёлета ўганараваны Дзмітры Дзмітрыеў за візуалізацыю вершаў і кнігу «Ліра спіралі».

Лаўрэатам у галіне паэзіі, якога абвясцілі Валянцін Акудовіч і Уладзімір Арлоў, стаў Уладзь Лянкевіч.

Віка Трэнас, прэсавая служба СБП

«Палац» — у Гомелі

У Гомелі адбыліся дзве творча-сакавіцкія сустрэчы ў межах прэзентацыі першага нумара літаратурна-мастацкага альманаха Гомельскага аддзялення СБП «Палац».

Гомельскія літаратары ўслед за пісьменнікамі Берасця, Горадні і Магілёва парадавалі чытачоў плёнам сваёй супольнай працы — пад адной вокладкай аб'ядналіся 35 аўтараў.

Прэзентацыі альманаха ладзіліся ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Францішка Скарыны і Гомельскім педагагічным каледжы імя Л. С. Выгодскага.

На сустрэчах прысутнічалі аўтары альманаха: старшыня Гомельскага аддзялення СБП Анатоль Бароўскі, сябры філіі, паэты Алесь Бардоўскі, Ларыса Раманава, Яўген Сергіеня, Арыя-Ульрыка Гатальская, Ганна Новік, Вадзім Болбас, бард Андрэй Мельнікаў і інш.



У гасцях у старэйшыны. Злева направа: сядзяць Міхась Даніленка, Анатоль Бароўскі, стаяць у першым шэрагу Барыс Пятровіч, Яўген Сергіеня, Вадзім Болбас, далей Алесь Камоцкі, Алесь Пашкевіч, Усевалад Сцебурака. Фота Анатоля Бароўскага

У імпрэзах узялі ўдзел запрошаныя мінскія госці — Барыс Пятровіч, Алесь Пашкевіч, Усевалад Сцебурака, Алесь Камоцкі.

Студэнты і выкладчыкі атрымалі прыемныя ўражанні ад сустрэчаў, а таксама — выданні серыі «Кнігарня пісьменніка» ды прызы ад кампаніі «Будзьма беларусамі!».

Падчас візіту ў Гомель калегі-літаратары наведалі аднаго з найстарэйшых пісьменнікаў Беларусі, сябра СБП Міхася Даніленку, які адсвяткаваў сваё 91-годдзе.

Ул. інф.

НАШ І МОЙ



Васіль ЗУЁНАК

У юбілейны для найстарэйшай творчай арганізацыі Беларусі год мы вырашылі пагутарыць пра перажытае з яе былымі старшынямі — тымі, хто дажыў да гэтай юбілейнай даты (на жаль, Максім Клімковіч, Пятрусь Броўка і Максім Танк ужо не адзін дзясятак гадоў гавораць з Вечнасцю).

Васіль Васільевіч Зуёнак узначальваў Саюз беларускіх пісьменнікаў напрацягу лёсавызначальных гадоў — з 1990 па 1998-ы. Старшыні-«аксакалу» мы і прапанавалі адказаць на загадзя падрыхтаваныя пытанні — а ў адказ атрымалі эсэ-ўспамін…

Да Саюза

«Набліжэнне» да Саюза было такое ж, як і ва ўсіх равеснікаў-пачаткоўцаў, — з першымі паходамі па рэдакцыях з надзеяй пабачыць свае радкі на друкаваных старонках. Штосьці ўдавалася «абнародаваць» і мне…

Але тое, што «было такое ж, як і ва ўсіх», у мяне абарвалася: сябры ішлі далей, а я прыпыніўся. Менавіта — «прыпыніўся», — не хтосьці «прыпыніў». Сам прымусіў сябе замаўчаць.

Чаму? А таму, што ўсё выразней пачаў адчуваць: трапляю ў нейкі тупік. Пішу правільныя словы, а душой застаюся наўзбоч…

Паэзія — не знешняя, штучна створаная «прыгажосць» са слоў, хай сабе і заплеценых у вянок радкоў, строф, вершаў, — а тая энергія, што выпраменьваецца імі, незаўважна, але адчувальна-насычана. Тое падобна электрычнаму току: нічога не бачна, а дайце кантакт — і ўспыхне святло. Паэзія — перадача духоўнай энергіі, — з аднае душы ў другую. Паэзія — кантакт з чытачом. Без яго, без гэтага кантакта, паэзіі няма — яна мёртвая… Паэзія — пытанні, адказы — у чытача…

Набліжаўся я і да першай сваёй паэтычнай кніжкі. Яна неўзабаве і з’явілася — пры шчырай падтрымцы як старэйшых, так і равеснікаў-сяброў. Рыгор Барадулін вітаў яе ў альманаху «Дзень паэзіі» яшчэ да выхаду ў свет словамі: «Чакаю зборніка!..» «Крэсіва» адзначыў грунтоўнай рэцэнзіяй Уладзімір Караткевіч…

Але ці не пра тое я ўсё, да чаго можна прышпіліць, пры жаданні, ярлычок «самаўхілення» (бароньбог — «самаўхвалення»)? Не, гэта пра тое, што так ці інакш адбывалася ў гравітацыйным полі ўсё таго ж Саюза — Саюза пісьменнікаў. Пра Саюз агульны — праз маё асабістае…

«Пропуск» на сяброўства ў ім абгрунтавала кніжка «Крэсіва», а рэкамендацыі далі мне Рыгор Бярозкін, Мікола Аўрамчык, Міхась Стральцоў… З такім «рэкамендацыйным шчытом», сапраўды, можна было ісці на пісьменніцкі «ўступны экзамен»…

Можна толькі лічыць за гонар: быць з такімі творцамі ў адным Саюзе.

Сяброўства ў СП

Не, я не ў крыўдзе на яго, на той Саюз, першымі сябрамі якога былі Янка Купала і Якуб Колас. Шчаслівы, што выпала магчымасць сустрэцца і слухаць самаго Канстанціна Міхайлавіча.. Слова яго было кароткае, але па-бацькоўску шчырае, простае і зычлівае. Гаварыў Якуб Колас, як трэба шанаваць роднае слова, берагчы талент, дадзены Богам, не растрачваць яго папусту…

Саюз даў творчую і жыццёвую падтрымку. А галоўнае — на ўсё гэтае жыццё — сяброўства, таварыскасць. І — школу. Слынныя пісьменнікі, майстры мастацкага слова не адгароджваліся «сцяною Саюза» ад пачаткоўцаў, хто ўступаў на літаратурны шлях. Не магу прыгадаць, каб хтосьці таленавіты быў «заціснуты», «закрэслены»… А спрыянне і ўвага былі і патрабавальныя, і добразычлівыя… Семінары маладых пісьменнікаў — у Дамах творчасці «Каралішчавічы», потым «Іслач» — праводзіліся рэгулярна і заўсёды сур’ёзна рыхтаваліся…

Помніцца, як перад пісьменніцкай грамадой выступаў са своеасаблівай творчай справаздачай настаўнік, пакліканы з Оршы, Уладзімір Караткевіч, аўтар усяго толькі аднаго надрукаванага ў часопісе «Полымя» верша. Але затое — які гэта быў верш, — «Машэка»! Прачытаў яго паэт, — можна сказаць, паўтарыў, бо ўсе ўжо ведалі тыя строфы, цытавалі напамяць. Прачытаў яшчэ — з ненадрукаванага, — і тут жа прагучала аднадушнае: «Прыняць Уладзіміра Караткевіча ў сябры Саюза пісьменнікаў». Што ні кажыце — мудры быў Саюз! Далёка наперад глядзеў. Прадбачыў — і не памыліўся!

Сяброўства ў Саюзе пісьменнікаў было і прызнаннем, і стымулам. А яшчэ — імкненнем не здрадзіць, быць верным таму, што пакутліва шукаў, да чаго імкнуўся і што аднойчы шчасліва адкрылася мне: быць верным самому сабе — і ў творчасці, і ў непасрэднай рэдакцыйнай працы…

«Кіраўніцтва»

Што змянілася пасля майго абрання ў «саюзнае кіраўніцтва»? Са мной — амаль нічога, апроч кабінета, стала ды новых абавязкаў. Творча я заставаўся тым жа — самім сабой.

А вось службовых, арганізацыйна-будзённых клопатаў навалілася — дай Божа!.. Але ён жа, здаецца, не адмаўляў і ў спрыянні. Праца побач з Максімам Танкам, Нілам Гілевічам, Іванам Чыгрынавым, Барысам Сачанкам надавала ўпэўненасці, развейвала сумненні…

Саюз пісьменнікаў… Саюз лёсаў, саюз творчых памкненняў і, калі хочаце, іншы раз — амбіцый…

Не, гэта не нейкі «агульны кацёл», у якім гатуецца «кніжнае варыва»…

Мудра вызначыў паэт Анатоль Вярцінскі духоўна-маральную катэгорыю — «чалавечы знак». Кожны мае яго, і ў кожнага ён свой, асаблівы, і да кожнага ёсць адзіна-непаўторны ключык, эксклюзіўны, як сказалі б сённяшнія інтэлектуалы. А калі чалавек творчы, катэгорыя гэтая ўзрастае, наэлектрызоўваецца ў разы…

У разуменні чалавеча-духоўных і мастацка-творчых лабірынтаў і ў стаўленні да іх несумненны прыклад падаваў Максім Танк. Ён не дапускаў і спробы, каб узвысіць сябе над кімсьці, да кожнага ён знаходзіў адметнае слова, заўсёды сказанае проста, па-таварыску. Ніякай «фанабэрыі», — заклапочанасць дык заклапочанасць, жарт дык жарт, шчыра, ад душы…

Мая сакратарская «дзялянка» ў Саюзе пісьменнікаў вызначалася працай секцыі паэзіі і Дома літаратара. І трэба падкрэсліць, што якраз на яго базе — Дома літаратара — пераважна і снавалася літаратурна-творчае жыццё. Паседжанні секцый, тэматычныя і юбілейныя вечары, сустрэчы… Планы метадычнага аддзела Дома літаратара заўсёды былі насычаныя і змястоўныя. І як тут не прыгадаць шчыраўніц — сур’ёзную і засяроджаную Марыю Арочка, а пасля — узнёслую і летуценную Ірыну Марачкіну. Захапленню і старанню іх не было мяжы. І ніякай мітусні, адладжаны рытм. Гэта з захапленнем адзначаў і мой «зменшчык» на сакратарскай пасадзе Алесь Пісьмянкоў… Амаль усе вечары Дома літаратара — з удзелам актораў (пераважна купалаўцаў), спевакоў, музыкаў — запісваліся з наступнай трансляцыяй на ўсю рэспубліку. Гэта быў росквіт тэле- і радыё-літаратурнага супрацоўніцтва. Нагадаю: там, начале Белтэлерадыё, быў у нас свой чалавек — выдатны паэт Генадзь Бураўкін.

Літаратурныя сустрэчы на самых розных прадпрыемствах — і гарадскіх, і сельскіх (самага разнастайнага профілю), у навучальных установах выклікалі ў людзей шчырую зацікаўленасць. Пісьменніцкія выступленні, якія арганізоўвала наша Бюро прапаганды мастацкай літаратуры, здаецца, не абмінулі ніводнага, самага аддаленага раёна і кутка Беларусі…

Усё гэта абуджае сёння толькі настальгічныя ўспаміны… Так было. Але…

Новыя «гаспадары»

Але падступіліся падзеі 90-х гадоў… Яны і кінулі Саюз у «кратар». Пачалася не праца, а барацьба за выжыванне. Першым аб’ектам супрацiву стаў Дом літаратара, дзе на той час знаходзілі сабе прытулак «лятучкі» актыву непажаданага для ўладаў дэмакратычнага грамадзянскага руху з непажаданымі ідэямі і планамі. А гэта не магло заставацца незаўважаным. Не дапамагло і тое, што дырэкцыя Дома літаратара прапанавала пэўную «маскіроўку» — афармляць арэнду (за сімвалічную плату), — «рыначныя адносіны», маўляў… Паступіла высокая рэпліка — «прыкрыць гняздо»… А разам з тым — распараджэнне перавесці Дом літаратара на баланс Упраўлення справамі прэзідэнта. А тое азначала прыход новага гаспадара з яго парадкамі, службамі і вартаю…

Так яно потым і атрымалася…

Але перад гэтым доўжылася ці не пару гадоў «перацягванне каната». Саюз пісьменнікаў усімі спосабамі імкнуўся давесці, што Дом літаратара — яго ўласнасць, што ён будаваўся на сродкі Літфонда, а з супрацьлеглага боку налягалі розныя праверкі з адзінай мэтай пацвердзіць дакументальна дзяржаўнае фінансаванне. Гэтая акалічнасць акцэнтавалася асабліва, бо Дом літаратара трапіў у «пераводны» спіс разам з іншымі арганізацыямі, статус якіх з самага пачатку вызначаўся як дзяржаўны, а ў нашым выпадку — «аб’ект», так бы мовіць, грамадскага (ды яшчэ і творчага) чыну… У спрэчку была падключана цытата з выступлення П. М. Машэрава на пісьменніцкім з’ездзе ў новым будынку Дома літаратара, дзе падкрэслівалася, што гэта падарунак пісьменнікам ад дзяржавы. А калі так, значыць, і фінансы задзейнічаны дзяржаўныя…

Дамовіліся правесці дэманстрацыю пратэсту — на вуліцы: «Фрунзе — 5, Будынак Дома літаратара»… Ды такая ўжо ў нас даўняя, закажанелая звычка: махаць кулакамі «да» і «пасля». А ў самы неабходны момант рашуча «скіснуць», знікнуць…

Лежачы на печы (седзячы за пісьмовым сталом), усе, выяўляецца, храбрыя. А вось жа як спатрэбілася сабрацца ля Дома літаратара, дык нават той, хто абяцаў уласным целам трымаць абарону на ганку, не з’явіўся… Праўда, і наяўных пратэстоўцаў хапіла, каб «запоўніць» адведзеную для пікета колькасць…

Нарэшце, бадай ужо на апошнім парозе ў «хаджэннях па ісціну»: Вярхоўны гаспадарчы суд РБ.

Вяла нашу справу абаронца, дарэчы, не толькі выдатны юрыст, але і паэтка — Вера Страмкоўская. Дык вось і тут суддзя, яе колішні аднакурснік, сказаў прыкладна тое ж самае «па сакрэце»: «Справа бесперспектыўная…»

Завяршэнне — фактычнае закрыццё Дома літаратара. Знікла нават сама назва: на будынку замест шыльды з адпаведным надпісам з’явілася: «Адміністрацыйны корпус №… і г. д.»

«Увага» ж да Саюза пісьменнікаў не абмежавалася адным Домам літаратара (ды і не магла «абмежавацца» — не тое задумана было)… За гэтым, як паказаў час, падаспелі і іншыя «дзяржаўна-адміністрацыйныя» наступы…

А тое, што ніякага змагання за Дом літаратара не патрабавалася, пацвердзіла «трыумфальнае ўваходжанне» ў будынак новаўтварэння — «Саюза пісьменнікаў Беларусі»…

Успомнім, што назва гэтая «прысвоена»: яе меў наш Саюз пісьменнікаў ад самага пачатку, ад заснавання ў 1934-м годзе, а потым, пад час, пра які ідзе гаворка (другая палова 90-х гадоў), адбылося перайменаванне ў «Саюз беларускіх пісьменнікаў» — паводле забароны ўжываць слова «Беларусь» у назвах грамадскіх арганізацый… А во, бачыце, і « забарона» не дзейнічае…

Новаўтварэнне гэтае, пэўна ж, і сталася тым «замоўленым» крокам. І адразу ж пайшлі сустрэчныя прэферэнцыі…

А ў прынцыпе гэта быў удар па пісьменніцкаму адзінству, якое не адно пакаленне славутых майстроў літаратуры мацавала сваім аўтарытэтам, а потым адстойвала і абараняла як гарант у змаганні за родную мову, нацыянальную культуру, духоўную спадчыну народа. Нагадаем тут прысвечаны гэтаму апошні ліст Народнага песняра Якуба Коласа, ліст у ЦК КПБ, ліст-папярэджанне і ліст-запавет… Нагадаем, што і аксакалы, на якіх меліся «разлікі», — народныя пісьменнікі Іван Пятровіч Шамякін ды Іван Якаўлевіч Навуменка, — не падтрымалі «новаўтварэнне», пажадалі застацца вернымі Саюзу, якому аддалі ўсе свае творчыя гады, Саюзу купалаўска-коласаўскаму.

Альтэрнатыва адзінству ў нашай сітуацыі нясе толькі адмоўны знак. Мацаваць трэба згуртаванне, а не разбураць…

А можа, і добра: раздзяліўшыся, аб’яднаемся?. Думка «ерэтычная» — але ж мы бачым, як узрастае маладое, вясновагалосае дрэва: шэрагі Саюза беларускіх пісьменнікаў папаўняюцца, умацоўваюцца — ідзе таленавітая моладзь. А гэта — і надзея, і гарантыя будучыні нашай літаратуры.

«Расці, умацоўвайся, дрэва», — скажам словамі Максіма Багдановіча. І пацвердзім Пушкінскімі: «Сябры мае, цудоўны наш саюз!..»

(Поўную версію тэкста можна прачытаць на сайце СБП www.lit-bel.org)

З рэкамендацыі Васілю Зуёнку на ўступленне ў СБП

«<…> Новыя мастацкія магчымасці аўтара яскрава раскрыліся ў зборніку «Крэсіва», які вылучае зайздросная сталасць паэтычнай думкі, высокая культура радка, умелае, творчае выкарыстанне фальклору, далёкае ад бяздумнай стылізацыі і саладжавай падробкі пад народнасць. <…> Аўтар знайшоў для сябе (і не толькі для сябе) удалае творчае вырашэнне нядаўніх спрэчак пра традыцыйнае і наватарскае, у сваёй паэтычнай практыцы не супроцьпастаўляючы адно другому. Прыклад, варты ўвагі і глыбока павучальны.

Несумненна, В. Зуёнак варты быць членам Саюза пісьменнікаў.

Міхась Стральцоў».

Нашых дзён крыгаход



Ірына ЖАРНАСЕК

Хлеб

Воглым кастрычніцкім ранкам, калі ці то смуга шчыльнага туману, ці то смог нафтавага горада спавівае дрэвы, апошнія восеньскія кветкі ды ліхтары з надакучлівым жоўтым святлом, якое зноў забыліся значы выключыць, блукаю па скверы каля майго дома і не магу адчапіцца ад навязлівых слоў: «Вось вам хлеб!».

Адкуль яны? Хто калі мне іх казаў? Альбо нехта некаму іншаму казаў іх, а я пачула? Але дзе і калі?

«Вось вам хлеб!»

Штосьці злоснае ў іх, здзеклівае, нядобрае…

«Вось вам хлеб!»

Чаму гэтыя словы ўроіліся мне сёння ў галаву ды выганялі з цёплага жытла ў кастрычніцкую воглую раніцу? І чаму я не хачу падумаць, што яны зусім нязлосныя, а наадварот… добрыя? Гасцінныя… «Вось… вам… хлеб!..»

Але ўгаварыць сябе не ўдаецца. Я чую гэтую злосць! Нянавісць. Чую яе спінаю, плячыма, штосьці горкае падступае да горла. Настаўляю каўнер, быццам спадзяюся абараніцца ад незразумелай няўтульнасці тых словаў, сціскаю ў кішэнях курткі кулакі і… успамінаю іх, гэтыя словы. Дакладней, не словы, а… боты. Бачу чорныя боты, што топчуцца па хлебнай рошчыне. Чорныя наваксаваныя боты энкавэдзіста — па свежай рошчыне. Побач на баку ляжыць дзяжа, з яе паволі выплывае ў пясок апошняе цеста. Воддаль дрыжаць ад сцюжы й страху дзеці — адзін пад адзін. «Вось вам хлеб!» Іхняя маці плача: яна нарабіла бяды — папрасіла чалавека ў ботах злітавацца, не выганяць яе з дзецьмі гэтак паспешліва з іхняе ж хаты. Бо яна рашчыніла цеста! Куды ж яны, без хлеба?!

Тады ён і вывернуў на зямлю дзяжу з рошчынай ды пачаў па ёй таптацца. Нават наваксаваных ботаў не пашкадаваў — такой ненавіснай аказалася для яго пахкая рошчына, якая магла б стаць цёплымі боханамі на кляновых лістах, што ляглі б адзін пры адным на белы ільняны абрус у іхняй хаце. Але абрус не дачакаўся хлеба. Бо прыйшоў ён…

«Вось вам хлеб!» — роў ён ды змешваў з зямлёю хлебную рошчыну, пераўтвараў яе ў гразь.

Потым іх пасадзілі на павозку і павезлі ў ноч. Дзеці плакалі, туліліся да маці, шукалі абароны. Іхняга бацьку вывезлі ў гэткую ж няветлую ноч два месяцы таму. Цяпер прыйшла новая ноч.

Павозка спынілася на мосце цераз нейкую раку. Ім загадалі злазіць… Потым ім пад ногі скінулі хатулі, якія мама похапкам паспела сабраць, пустую дзяжу, кошык з бульбай, што стаяў на падворку, і ночвы.

Ліў дождж. Была чорная ноч. Аберагаючы самага меншанькага, маці накрыла яго ночвамі…

Я пачула гэтую жудасную гісторыю ад жанчыны, якая ў той даўні вечар не спякла хлеба сваім дзецям. Ад хлопчыка, цяпер мажнога мужчыны з задумліваю тугой у вачах, якія ўсцяж узіраюцца кудысьці ўглыб, ад таго хлопчыка, якога захінулі ад сцюдзёнага дажджу ночвы. Мне распавядалі яе тыя, што ў тую даўнюю, сцюдзёную ноч дрыжэлі на мосце ад холаду й страху. А таксама тыя, што ніколі не бачылі ні таго маста, ні дажджу, ні той хлебнай рошчыны на іхнім панадворку. Але яны ведаюць, што жывуць на гэтым свеце таму, што маці, чый хлеб быў растаптаны, сумела яго сабраць. У іншым месцы. Яна знайшла ў сабе сілы прайсці цераз той мост, той дождж, праз усё тое, што чакала іх за тым мастом і дажджом. Яна сумела рашчыніць новую рошчыну, спячы хлеб і выгадаваць сваіх дзяцей.

…Нялёгкая гэта праца — збіраць растаптаную рошчыну ды пячы новы хлеб.

Кава

Зварыла каву. Не выпіла сама і гасцей на яе не паклікала, а ўліла ў тэрмас і панесла тым, хто, не зважаючы на мароз і сцюжу, не жадаў развітацца з марай аб свабодзе. Ды толькі напаіць тых упартых летуценнікаў ёй не ўдалося, бо і сама заплаціла за свой учынак сямі соднямі свабоды.

Мая цёзка… Паэтка… Чые вершы такія паветраныя, лёгкія, а часам… з гаркавым прысмакам чагосьці палыновага. Можа, гэта прадчуванне нявыпітай на пляцы Каліноўскага кавы ў імя свабоды?.

Калі я пачула пра тую нявыпітую каву, я ўпершыню пашкадавала, што жыву далёка ад гасціннай гаспадыні. А я?

Бачу чорныя боты, што топчуцца па хлебнай рошчыне. Чорныя наваксаваныя боты энкавэдзіста — па свежай рошчыне. Побач на баку ляжыць дзяжа, з яе паволі выплывае ў пясок апошняе цеста

Што зрабіла б я, калі б была ў тыя дні бліжэй? На жаль, я не ўмею заварваць смачнай кавы, бо сама вырасла на зёлках. Дык у той вечар, напэўна, спякла б пірог. І прынесла б яго тым, хто адважна мерзнуў, зусім не разлічваючы на каву з пірагом.

І тады, магчыма, мы разам з ёю гаманілі б цэлых сем содняў… Пра літаратуру. Тыя ж, з калідора, лічылі б нас звіхнутымі. А зрэшты, і без нашых сямісодневых гутарак яны гэта ведаюць цвёрда.

Усё гэта магло б быць… Ды я жыву занадта далёка ад аўтаркі вершаў з палыновым прысмакам ад нявыпітай на пляцы Каліноўскага кавы. І ўпершыню адчуваю сябе вінаватай з гэтае



Фота www.holper.by

прычыны. Бо таго вечара я не спякла пірага. І ў нас не было сямісодневых гутарак пра літаратуру.

«Але гэта лёгка выправіць», — нібы чую голас кагосьці нябачнага з калідора.

Голас таго, каму нецікавыя нашы гутаркі пра літаратуру. Ён і без іх ужо стаміўся.

Графіці

— Як яны абрыдлі ўжо, гэтыя мазюкалы! — бурчыць дама з шыкоўным рудым шыньёнам на галаве, нібы выпаўшы раптам з 70-х. — Во! Учора ішла каля гэтага дома і яшчэ была сцяна чыстая, а за ноч ужо напэцкалі пра сваю Еўропу… Я такіх садзіла б у карцары без права перапіскі!

Дама спяшаецца ў святыню на ранішняе набажэнства. А я, спалохаўшыся за будучых насельнікаў перапоўненых карцараў, знаходжу, як мне выдае, жалезны аргумент для абароны невядомых мне мастакоў.

— А вы чулі, — радасна прыгадваю я, — што святы Максімілян Кольбэ таксама маляваў на сценах графіці! Калі Польшча была, як кажуць палякі, «пад заборам расейскім», ён маляваў на сценах аднагаловага арла ды пісаў: «Ешчэ Польска не згінэла!»

— Калі гэта было? — паўзуць у дамы начорненыя бровы пад самую стрэшку рудога шыньёна.

— Калі ён быў такі, як яны, — ківаю я на размашыстыя надпіс на сцяне пра Еўропу ды пра нас, каму, на думку аўтараў, не шкодзіла б там апынуцца.

Пабожнай даме яўна недаспадобы неабачлівыя ўчынкі святога Максіміляна. Яна хмурыць бровы, напружана думае, а потым выгуквае свой аргумент з такой пераможнай радасцю, быццам ёй нарэшце пашэнціла ў супер-лата на БТ:

— Ну дык і скончыў гэты твой Максіміліян у газавай камеры!

Ад непадзяванага ўдару пад саменькую дыхавіцу я слізгаюся на лёдзе, прыцярушаным лёгкім сняжком, і падаю. І ўжо з долу гукаю ёй свой апошні аргумент:

— Але ж ён сам туды пайшоў! Ён пайшоў у газавую камеру… за іншага чалавека!..

— І што, гэта разумна? — смяецца дама ды падае мне руку.

Я маруджу. Я чамусьці зусім не маю ахвоты падымацца з гэтага лёду, з белага снегу, пад якім схаваўся слізкі лёд. Мяне апаноўвае раптоўная прага малітвы.

— Святы Максіміліяне! — малюся я, не адрываючы вачэй ад белага снегу, — будзь нябесным апекуном для гэтых аўтараў графіці! Ты іх разумееш…

Вялікі Чацвер

На прыступках касцёла брудны, даўно няголены чалавек у пакамечанай хламідзе, што ліха ведае калі бачыла апошні раз ваду, просіць міласціны.

— Калі можа пані чым-небудзь памагчы… — мармыча ён, апусціўшы долу даўно патухлыя вочы, і ў іхніх шэрых, нібы попел, руках уздрыгвае гэткага ж попельнага колеру поліэтыленавы пакет з пакамечанымі грашовымі паперкамі.

Людзі праходзяць паўз яго ў касцёл. Напэўна многія хацелі б з ім размінуцца, але іншых дзвярэй у святыню няма і яны вымушаныя ісці тут. Некаторыя моўчкі кідаюць у шэры пакет грошы і, не даслухаўшы пажадання здароўя ад непажаданага чалавека, адчыняюць цяжкія дзверы. Некаторыя праходзяць міма, і на іхніх тварах не ўздрыгвае ніводная рыска. Некаторыя дакорліва і адначасна спачувальна хітаюць галовамі. Зрэдку хтосьці з мінакоў не вытрымлівае і бурчыць: «Дзе вас толькі няма! Пад кожнай крамай стаіцё, папрашайкі няшчасныя, а цяпер і сюды дабраліся». Тыя, што кідаюць гэткія рэплікі, рэдка бываюць у касцёле, яны хутчэй за ўсё — з «двухразовых наведнікаў», з тых, што прыходзяць у касцёл на Каляды і Вялікдзень. Бо калі б яны былі тут часцей, дык заўважылі б, што «папрашайкі» дабраліся на гэты ганак нашмат раней за іх.

Маладая сям'я — мама, тата і двое малых, адзін з якіх яшчэ бяспечна дрэмле сабе ва ўтульным маміным жываце, а другі бесклапотна падскоквае побач з бацькамі — спыняюцца каля жабрака, і пасля кароткай сямейнай нарады малы кладзе ў шэры пакет грошы ды застывае з адкрытым ротам каля бруднага чалавека. Маці бярэ яго за руку, вядзе далей, а ён азіраецца колькі разоў, і ягоная ўвага адцягваецца ад бруднага чалавека пасля татавых словаў да мамы: «Вытры вільготнай сурвэткай Даніку рукі».

Высокі мужчына ў скураным паліто і чорным капелюшы пазвоньвае ключамі ад чорнага «бумера», якому ён знайшоў-ткі адпаведнае месца на прыкасцельным невялічкім пляцы. Яшчэ заняты нядаўнім няпростым клопатам, не заўважыў чалавека на прыступках і не пачуў ягонага: «Калі можа пан чым-небудзь…» А можа, той і не прасіў у яго?. Можа, мне гэта выдалася?

— Я табе хлеба, чалавек, прынесла, — старая жанчына ў квяцістай хустцы, успёршыся на кій ды аддыхаўшыся, дастала з сумкі бохан хлеба ды палову кавалка масла «Крестьянское». — Куды табе тут? — узняла вочы на жабрака. Ён сунуў бохан пад паху, а масла ў кішэню сваёй хламіды, з падранай кішэні якой яно слізганула яму пад ногі. Яны абодва нахіліліся яго падняць ды стукнуліся галовамі. Жанчына засмяялася:

— Во! Раднёй будзем!

— Навошта табе, добрая ты душа, гэткае сваяцтва? — прахрыпеў жабрак і цяжка закашляўся.

З касцёла данесліся гукі аргана — пачыналася Імша.

Будзе сонца!

Свой час

Калі сядзець на беразе мора Альбаран і глядзець у бок Афрыкі, то можна метафізічна адчуць, што такое ўскраек Еўропы. Назва мора паходзіць ад назвы невялікай выспы, а яго імя адносіць нас да іспанскага albor — 'белась', 'світанак', 'пачатак'. А белась, як вядома, — гэта наша ўсё. Альба Рутэнія, БНР, Радзіма-мая-дарагая. Самі разумееце...

Іспанка Ангела Эспіноза ніколі не была ў той Беларусі-Альба Рутэніі-Крывіі. Але яна піша вершы і прозу па-беларуску. «Лупіць» на тарашкевіцы ў сваім блогу. І жыве яна на беразе мора Альбаран.

Калі сядзець на беразе Сожа і глядзець у бок Азіі, адчуванне краю Еўропы набывае прыроду фізічную. Канкрэтную, як загад чырвонага камандзіра. Ёсць меркаванне, што людзі, якія атачаюць еўрапейскую прастору і прапускаюць яе мяжу праз сябе, хутчэй разумеюць адно аднаго. Можа быць, публікацыя беларускамоўнай іспанкі — якраз выпадак такога паразумення?

Студэнтка з далёкай краіны, яна плакала дзве гадзіны, калі Рыгор Барадулін пайшоў ад нас у лепшы свет. Але, здаецца, што і гэты свет не такі дрэнны, калі іспанцы пачалі пісаць па-нашаму без перакладчыкаў. Тут толькі здаецца, а зверху бачна лепш. Усе вучні калі-небудзь сустракаюць сваіх настаўнікаў, і кожнай сустрэчы — свой час. У сваім месцы, на сваёй мяжы.

Алесь Плотка, беларус свету



Ангела ЭСПІНОЗА

Вайна

А ў запале бітвы
У (цяпер нашым) горадзе ціха,
І ў пакоі цёпла.
У трывожным спакоі ночы
Сьнег падае павольна.
Толькі каля белага будынка,
Дзе працуюць шэрыя мужчыны і жанчыны
(Цяпер таксама ноччу)
Гараць сьвечкі, зьнікаюць кветкі
Белыя, чырвоныя, блакітныя, жоўтыя…
Яны ў цемры ўсе аднолькавыя.
Кроў на камянях плошчы,
Новая, сухая,
Металічны смак удару
(Ці ўспамін пра яго):
Усё ў цемры аднолькава.
Сьлёзы.
Разьвітваемся. Цалуемся.
Ты кажаш: «я цябе кахаю»,
Я кажу: «я таксама».
Мы кажам: «беражы сябе».
Думаем, «які складаны час, каб закахацца!».
Гэтага ня кажам.
Ідуць танкі.

Пасьля вайны

Так застаўся пакой пасьля вайны:
Чатыры апельсіны ў пакецiку,
(Ці, можа, толькі тры).
Твой пах у паветры. Мой пах.
Наш з табой пах.
Палова бутэлькі віна,
Мора пасьцельнай бялізны,
Скрынка чагосьці салодкага
(Пустая, вядома),
Ружы, чырвоныя ружы на падваконьніку.
Маё сэрца. Тваё сэрца.
Наша з табой сэрца.
На падваконьніку паміраюць.
І ўспаміны…
Так застаўся пакой пасьля вайны.
(Нашай з табой вайны).

Бездапаможнасьць

Чаму не згасла сонца?
Чаму не пераапранулася неба
У чорныя хмары?
Чаму не замаўчаў сьмех?
Чаму не перасталі гуляць дзеці
На вясёлай вуліцы?
Чаму, усё ж такі, пачалася вясна?
Чаму вярнуліся чорныя ластаўкі
Да нашага гаўбца?
Чаму цябе няма?
Чаму яго няма?
Чаму радуюцца людзі?
Хіба не бачаць, што няма паэзіі?

Зямля…

Зямля, круціся хутчэй,
Каб я згубілася ў часе!
Каб я нічога ня бачыла,
Каб ня чула,
Каб не адчувала.
Зямля, круціся хутчэй,
Каб я таксама
Хутчэй сьпявала
У чароўным лесе,
Дзе стаіць старадаўняя вежа нашых мараў.
Зямля, круціся хутчэй,
Пературвары мяне ў птушку,
Каб я глядзела зьверху на турботу,
Каб нарадзілася ад цябе зноўку,
Сярод попелу.

Пад зямлёй

Гадзіны павольна ходзяць,
Калі холад, ноч і адзінота.
Малады хлопец чысьціць бруд з ботаў,
У соты раз перачытвае яе ліст,
Словы якога даўно страцілі значэньне.
«Сумна жыць духам, ды без душы…»
Моцна трымае халодны метал.
Да зараніцы яшчэ чатыры гадзіны;
Як усё ціха! Як усё цёмна!
Да пацалунку яшчэ адзінаццаць месяцаў і шэсць дзён;
Як крычыць сэрца!
Як плачуць яе зялёныя вочкі!
Думае пра ўсякія дурасьці:
«А можа, маюць рацыю з гэтым словам…
Мы пад зямлёй жывем».

Будзе

Ды зноўку будуць мары, будзе сонца,
І будуць бегаць коні па дарогах,
Будзе гучаць твой голас на спатканьні,
Будзе каханьне!

Ды будуць кветкі новыя ў нашых сэрцах,
Будзе вясна ў душы, цяпло, прыемна,
Будуць зьзяць зоркі ды новая эра,
Будзе вера!

Ды будуць сьлёзы, дабро, зло ды шчасьце,
Будуць песьні, прыгожыя дзяўчаты,
Зноў будзе сьмех, пачуцьцяў сінэстэсія,
Будзе паэзія!

Згушчаныя гісторыі. Беларусь. Мужчынская серыя.

I. Ён ніколі не губляў надзеі, хоць сітуацыя была сапраўды цяжкая, і краіна, за якую ён змагаўся, не была цалкам яго. Ён нават не падумаў пра магчымасьць кінуць сваю касу і бегчы. Пачуўшы размовы вакол (адну на беларускай мове, другую на польскай), ён адчуў сябе неяк мацней. Кожная сям'я накіравала здольнага маладзёна, каб прадстаўляў яе ў гэтай вырашальнай вайне — і адчуванне сябе часткай чагосьці суцяшала яго. І, па праўдзе кажучы, думкі пра свой лёс па-за адзіным грамадствам, якое ён ведаў, яго палохалі.

II. Два дні прайшлі з моманту, калі ён увайшоў ва ўсходні форт цытадэлі. Два дні прайшлі амаль бяз шуму, насычаныя слабым пахам пораху і тоўстых, чырвона-цагляных сьцен крэпасьці. Ужо бракавала прадуктаў харчаваньня; яго таварышы распавядалі гісторыі, каб прабавіць час, ня згадвалі пра адсутнасьць контратакі і пра тое, што іх засталося няшмат. Нас ня больш за чатырыста, ён падумаў, паглядзеўшы вакол. Але я не пакіну крэпасьць, і яны таксама.

Выбух прагучаў рэхам, як голас Бога. Асьляпляльнае сьвятло. Абсалютная цемра.

III. Яшчэ ён бачыў, як на сьвітаньні кідаюць целы яго таварышаў на сьнег, на зьдзеньне ваўкам. Потым прывезьлі новых (яны маладыя, падумаў ён з горам). Іх твары ён беспасьпяхова стараўся не запомніць. Калі б не яго непарушная вера, праца і невыносны холад яго б забілі за два гады. Зьнясіленьне зноў заваявала яго зацёклыя канечнасьці. Ноч была цёмная, калі ён вярнуўся ў яму, дзе ўсе яны (ўсе трыста) разам спалі. Яны сапраўды не былі вартыя нават аднаго патрона. Ён маліўся.

IV. Юнак так і не зразумеў, што зь ім здарылася. Магчыма, гэта было праз стомленасьць чуць хлусьню, або ад звальненьня з працы, або чыстая цікаўнасьць. Ён сышоў на плошчу, нават не папярэдзіўшы сваю бабулю. Ён ішоў і сьпяваў, і пляскаў разам зь іншымі, нібы ў нейкім трансе; ён нават некалькі хвілінаў трымаў канец банэра. Яго цела пакінула малінавы сьлед на белізьне сьнегу. Хіба гэта была дрэнная прыкмета? Знак надзеі? Юнак так і не зразумеў, што зь ім здарылася.

Прашу прабачэньня

Ноч. Маладая дзяўчынка глядзіць на мяне праз шкло. У яе чорных вачах калісьці гарэў агонь. Гэта відавочна. Цяпер — адна пагарда. Яна нічога ня кажа; толькі глядзіць. Але я, здаецца, усё разумею. На бледным яе твары зіхціць сьвятло страчанай нявіннасьці і апошняга чыстага каханьня. Яна ледзь жывая, а якая пагарда… Гучаць ува мне словы польскай песьні… A w serca już, zamiast krwi popioły tylko i kurz… Так, у сэрцы засталіся толькі попел і пыл. «Паэтам», яна кажа шэптам і жорстка ўсьміхаецца, «трэба таксама спаць». Яна сьмяецца. Я разумею, што я не ведаю. Ёй амаль 18 гадоў. 17 назаўсёды. Яна ўсё ж сьмяецца і незямным голасам мне распавядае, як кепска плакаць за каханка… «Ты, о паненка, з іншага боку шкла», кажа ўрачыста (а я старэй за яе, мне цяпер амаль 21), «каго любіш?», пытаецца. Яна, зразумела, сьмяецца зь мяне. І слушна. «Паэтам трэба таксама спаць, і зьдзічатым таксама», яна кажа. Сьмяецца. Я маўчу і плачу. Я ведаю, што за тры гады нічога не дасягнула. У мяне адна пантаміма. У яе адна пагарда. «Даруй», я кажу. «Ідзі спаць», яна адказвае. «Прашу прабачэньня». «Паэтам», яна прамаўляе гэтае слова з агідай, «трэба таксама спаць».

Раніца. Люстэрка паказвае малады твар з цёмнымі кругамі пад вачыма. У галаве толькі адна думка: «Уставай, пішы, твары!». У вуснах адна фраза: «Паэтам трэба таксама спаць». А ў сэрцы ўжо толькі попел і пыл? Не, ёсьць раскаяньне, ганьба і абяцаньне ўсё выправіць. А ўсё ж такі на імгненьне здаецца, што яна ўсё сьмяецца…

Яму

Калі я была зусім маленькая (а я навучылася чытаць даволі рана), я мела кучу кніг народных казак, і гішпанскіх, і замежных. Я доўгія гадзіны чытала ды чытала; вядома, я менавіта там упершыню пачула слова «каханьне».


Цяпер я вялікая, чытаю класічную літаратуру, але ўнутры часам адчуваю сябе як спуджаная дзяўчынка. Чаму, вы пытаецеся? Распавяду.

Калі я ў дзяцінстве чытала пра каханьне, прынцэсы не павінны былі страціць яшчэ 5 кілаграмчыкаў, прынцы мелі здаровыя ногі, і абсалютна ўсе захапляліся рыцарам у зіхоткіх дасьпехах. Тады лёгка было выдаліць дрэнных цароў і заўсёды знаходзіўся спосаб, каб не аддаць першароднага дрэннай ведзьме. Калі я ў дзяцінстве чытала пра каханьне, самога каханьня заўсёды было дастаткова і можна было пераадолець самыя вялікія адлегласьці за ноч. Кароль і каралева былі заўсёды рады аддаць руку і сэрца дачкі любімаму, і самая галоўная прыгажосьць, вядома, была ў душы.


Цяпер я, як маладая дарослая дзяўчына, адчуваю сябе ўразьлівай, таму што зразумела, што нават каханьне не бывае ідэальным. Ні жыцьцё, ні справядлівасьць, ні праўда. Ні я.

Але яны ўсе невыказна прыгожыя. Нават больш, чым калі я пра іх чытала ў дзяцінстве. І таму я імкнуся, спадзяюся, дыхаю.

Кахаю.



Стары і смерць



Алесь ЖУК

Ён жыў адзін. Здаецца, даўно-даўно, нават усё жыццё, хаця жонка памерла адзінаццаць гадоў назад. Найцяжэй было перажыць зіму. У старасці свет для чалавека зусім робіцца малым. Адышлі старыя сябры, новых няма, ды і заводзіць іх няма жадання. Ён спрабаваў заводзіць кампанію, але не атрымалася. Як правіла, кампаніі канчаліся выпіўкай, а піць ён не любіў. У маладосці займаўся альпінізмам. Там піць не прынята. Удачнае ўзыходжанне адзначалі. Яшчэ запівалі непагоду, калі ў горы не было чаго сунуцца. Ды і выпіўка ў маладосці была ад весялосці, а не ад жадання заліваць адзіноту.

Што ён меў на старасць? Аднапакаёвую кватэрку, якая засталася пасля выхаду замуж дочак. Яны павыходзілі замуж адна за адной, і ён з лёгкасцю размяняў сваю чатырохпакаёўку, каб даць малодшым прытулак. Цяпер муж старэйшай трымае гандлёвую кропку, як любіць гаварыць гэта сам, а ў малодшае муж наогул дальнябойшчык. Унукі адны кончылі інстытуты-ўніверсітэты, у яго ажно чатыры ўнукі. Ён жартам папракаў дачок: ну хоць бы адна нарадзіла дзяўчынку. Адным словам, жывуць па-сучаснаму, а цяперашняга жыцця ён не ведае, яно нейкае хуткае. Нават, на яго розум, каламутнае. Але і дзеці і зяці адчуваюць сябе ў ім нармальна.

Усё жыццё ён прапрацаваў у архітэктурным бюро. Рабочы дзень пачынаўся рана, канчаўся па раскладзе. Ён так быў прывык да яго, што яшчэ некалькі гадоў пасля пенсіі працаваў. Весялей было з жонкаю, яна ў яго была балбатлівая, яны разам пабудавалі гэтак званую дачу. Домік на дачным участку. Домік гэты быў не ад яго арганізацыі, проста арганізатары садовага таварыства выйшлі на яго. Ён зрабіў ім праект, ды і так дапамагаў, калі што трэба было. У аддзяку яму ў тым таварыстве выдзелілі ўчастак. Трэба сказаць, што арганізацыя тая была салідная, ці нехта прабіўны займаўся той справаю, бо атрымаў дазвол «наверсе» «ўпарадку выключэння» весці забудову «па індывідуальных праектах». Тады на ўсіх гэтых садова-агародных участках дазвалялася будаваць лёгкія шчытавыя домікі, без усякіх там печак. А тут хоць вясковую хату перавязі і пастаў. Што многія і зрабілі замест таго будаўніцтва па індывідуальных праектах.

А стары старызну перавозіць не хацеў, харомы яму таксама былі не патрэбны. Ён раздабыў нармальнага здаровага лесу, і атрымалася ў яго хатка, але калі глянуць і цяпер, то невялікі дамок на два пакойчыкі плюс прыстроеная даволі прасторная веранда. Жонка спачатку бурчала на яго: што ты мне хатку бабы ягі выбудаваў. Але калі ўсё выфарбавалася, больш старога не чапала. Атрымалася так, што ён быццам і прадбачыў, што дзецям і моладзі гэтыя садова-агародныя ўчасткі будуць не патрэбны. Не зацягнуць сюды было і дочак, а як павыходзілі замуж — тым больш, на шашлыкі і то лічаныя разы прыехалі. Старая адна, пакуль магла, рабіла грады, засяляла цяпліцу. Адно вартае, што ён зрабіў на дачы — пасадзіў сад. Для саду ўчастак быў прыдатны: гліна была недалёка, а сад такую зямлю любіць.

Вось па яблыкі прыязджаюць і дочкі, нават абіраць яму апошнія гады памагаюць. Наогул дочкі дапамагаюць яму. Падвозяць і прадуктаў, а галоўнае — забіраюць дадому і ў пральных машынах мыюць бялізну. Інакш быў бы яму лішні клопат. А так і пасцельная бялізна, і шторы, ды нават і ягоныя курткі мые сучасная тэхніка.

Такое вось яно, старэчае жыццё. Можна, вядома, ім і суцешыцца, калі не ганарыцца, можна бясконца ўспамінаць маладосць, але найбольш успамінаць тыя часы, калі ён займаўся альпінізмам. Найбольш ён бываў на Каўказе, але давялося глядзець і суровы Цібет, і на Урале бываў, і ў Саянах...

Цяпер у яго ёсць патрэбны дачны рыштунак, інструменты, і даставаць нічога не трэба. А ўсё жыццё даводзілася даставаць, асабліва імпартную мэблю. Цяпер ён часам здзіўляецца, што яму яшчэ і цікавым было тое даставанне. Хутчэй за ўсё з-за маладосці было цікава, бо ў маладосці ў чалавека многа энергіі. А цяпер яму хапае задавальнення корпацца на дачы. У яго там свая гаспадарка. Дагледзець, абрэзаць сад, яшчэ мае градку садовых суніц, крыху агароднай зеляніны: смешна дачніку па гэта ездзіць у горад. Дзеля гэтага яшчэ вясною ставіць маленькі парнічок, каб быў пад рукой кропчык, салата, цыбульнае пер'е і нават маладзенькі агурочак. Парнічок потым здымае.

Калі быў маладзейшым, то ў лесе, які пачынаецца за метраў дзвесце ад яго хаткі, сам нарыхтоўваў і дровы. Там было шмат малады бяроз, якія пад сілу і старому чалавеку, і сухастоесасняку многа. Цяпер такія, як ён, ахвотнікі малады бярозкі павырэзвалі, а тыя, што засталіся, выраслі ў мацёрыя бярозы, якія яму не ўзяць, каб нават была і бензапіла. Дровы цяпер ён купляе ў мясцовым гартопе, пацяху коле, а тыя калодкі, што яму не падсілу, пакідае на зяцевы рукі. Печку яму прапальваць трэба, бо на дачу ён прыязджае з вясны і сядзіць там да першага снегу і халадоў.

Спіць ён доўга, як мінімум да адзінаццаці гадзін — адсыпаецца за многія гады, калі трэба было хадзіць на работу. Хаця думае яшчэ, што гэта простая старэчая санлівасць, але нават самому сабе ў гэтым прызнавацца не хоча. Урэшце яму на яго работу хапае і астатка дня. К канцу дня апошнім часам стамляецца.

Летам на дачах людзі, можна перакінуцца словам. Зімою сябе



заняць намнога цяжэй. Урэшце, у яго пакойчыку ёсць тэлевізар і нават дзве паліцы-стэлажы з кнігамі. Ён застаў той час, калі краіна была ўсёчытаючай, тады кнігі, дарэчы, як і мэблю, трэба было не купляць, а даставаць. Даставаць лепш умела жонка. Ён і цяпер здзіўляецца, як ёй гэта ўдавалася. Ды яшчэ большменш прыстойна адзявадь двух дзяўчынак. Пазней крышталёвы посуд, які проста стаяў у некалі модней «сценцы», разабралі дзяўчаты, бо ён урэшце стаў непатрэбным яму.

Куды дзелася тая сценка, ён і не памятае. Стары быў рады, што дзяўчаты прыстроіліся ў жыцці, ды неяк і неўпрыкмет выгадавалі ўнукаў. Прыязджалі да яго на дзень нараджэння. Дочкі прывозілі ежу, накрывалі стол, яго «камерсант» нязменна прывозіў бутэльку брэндзі, як ён гаварыў, фірменнага. Мужчыны здаровы, ён адзін і выпіваў яе. Бо другі зяць толькі браў у губы. А ўнукі — дык тыя наогул пілі напіткі. Старому крыху было дзіўна, што такая мода ёсць у маладых, але ён гэтаму радаваўся.

У яго была шчаслівая натура: ён не ўмеў крыўдзіцца на людзей, а на дзяцей сваіх тым болей. У іх было сваё жыццё. Нават з гумарам ён часам успамінаў стаўпатварэнне ля электрычак на перонах. Кожны нармальны чалавек па тых паняццях павінен быў мець «дачу», толькі так між сабой называлі тыя загародныя соткі, у калектывах за іх ішлі цэлыя войны; чалавек немаладым ужо, але не прабітны, ён так і не патрапіў у першую хвалю раздачы прыгарадных пустак пад садова-агародныя таварыствы. І добра што не патрапіў, бо тыя таварыствы, вядома ж, праблему з забеспячэннем гароднінай не знялі. Выйшла так, што без вялікае таўкатні і атрымаў тыя «соткі». Тады на дачах было шмат дзетвары, дзеці, можна сказаць, і павырасталі на тых дачах.

Дарослым за садова-агароднымі клопатамі не хапала часу на дзяцей, ім, слава Богу, была воля. Было поле, нават невялікі лясок, якога хапала, каб прыносіць дадому вёдрамі чорныя грузды.

Стары нават і не прыкмеціў, як пайшоў скарот таго жыцця: паменшала на вуліцах дзяцей, пацішэлі жаночыя галасы, ды і наогул людзей паменшала. Людзі, відаць, як дрэвы ў лесе, не заўважаюць, што іх робіцца ўсё меней і меней. Толькі грыбнік усё часцей спатыкаецца аб упалыя пагнілыя ствалы.

На прыродзе, калі ўсё жывое пачынала адыходзіць у зімовае небыццё, не гнялі і доўгія зімовыя вечары, не так адчувалася адзінота, бо да гэтага часу дачнікі амаль усе раз'язджаліся, некаторыя толькі паказваліся ў пагодныя выхадныя дні. Была нейкая зніт аванасць з прыродаю. Выключэннем былі хіба слотныя, з парывістым ветрам дажджлівыя дні і ночы. Тады пачынала здавацца, што ўсё навакал, нават сцены доміка,

У яго была шчаслівая натура: ён не ўмеў крыўдзіцца на людзей, а на дзяцей сваіх тым болей. У іх было сваё жыццё

прамакалі наскрозь, але і цешыла цяпло ад прапаленае на ноч печкі.

А вось з гадамі гнятлівасць у гарадской кватэры, асабліва ў першай палавіне зімы, даставала, псавала настрой. Стары не знаходзіў сабе занятку, не суцяшалі і кнігі. Хаця ён заўважыў, што кнігі маюць дзіўную здольнасць — успрымацца па-іншаму. Ні з таго ні з сяго пачынаўся перачытвацца Тургенеў, яго раннія маладыя аповесці, захаплялі незразумелыя спакойнасць і размеранасць «Дваранскага гнязда». Ён нават часам кпіў з самога сябе: навошта яму, згрыбеламу, той ранні Тургенеў? Ды і навошта напакоўваць галаву веданнем новага, калі ўжо хутка не стане і яго самога з тымі ведамі. Аднак уцеха была, відаць, так Бог прыдумаў чалавека, а той у сваю чаргу і нейкае іншае, пазагробнае жыццё. Выходзіла, што гэта ён назапашваў веды да таго пазагробнага жыцця. Гэта канчаткова развясельвала.

А потым стары, на пачатку зімы, калі пачалі брацца сухія чыстыя марозікі, знайшоў нечаканы для сябе занятак.

Калі разоў ён праходзіў у Траецкім прадмесці паўз невялікі, быццам цацачны помнік, не звяртаў на яго ўвагі. На тым помніку бадзёра крочыў з мяшэчкам і кіем у руцэ чалавек. Потым старому здалося, што гэты чалавек на помніку ў нечым падобны на яго. І галоўнае, што ішоў ён цвёрда, ведаючы, куды ідзе. Была ў гэтым чалавеку нейкая незразумелая і прывабная яснасць.

Потым старога ад гэтага помніка штосьці павяло — інакш і не скажаш — у Купалаўскі парк, і не да самога манументальнага паэта, а да дзяўчатак, якія нястомна ў любую пару года пускалі на ваду свае вянкі. Была нейкая магія ў тым метале. Далей — болей, ён пачынаў прыглядацца да кавальскае работы на рашотках балконаў рэдкіх ужо старых домікаў.

Новага, разбудаванага на вялікай плошчы горада ён не ведаў, не мог ахапіць яго. Ды ён і не надта цікавіў яго.

Цяпер стары ў шэранькім прыкараткім паліто, у неграмоздкай шапцы-вушанцы, вушы якой былі завязаны на патыліцы, з адмысловым ядлоўцавым кіёчкам, які ён зрабіў сам, кожнага дня выбіраўся ў горад. Ён любаваўся танцуючымі дзяўчатамі на былой Паркавай магістралі, сядзеў на лаўцы з дзяўчынаю ў прывакзальным сквэры, любаваўся карэтаю для аднаўленай ратушы. Калі б наглядаць за ім збоку, то магло б скласціся адчуванне, што чалавек нешта настойліва шукае. І ў сваіх пошуках ён адчуваў сябе лёгка і бадзёра нават у марозныя дні. Яго някідкае шэрае паліто мела мехавую падкладку, згробныя рукавіцы таксама былі цёплыя і грэлі старэчыя рукі.

І чым болей блукаў стары па горадзе, тым часцей ён успамінаў мясціны, дзе не толькі жыў, а дзе і проста бываў калісьці. Успомнілася яму і старое Сляпянскае возера. Яно зарастала, мялела за Батанічным садам. З другога боку яго засланілі новыя дзевяціпавярховыя будынкі. Але возера працягвала жыць, і ўздоўж ручаіны, ад якое яно пачыналася, на балаціне раскашавалі высокія трысягі. Там дзесьці былі яшчэ з чырвонае цэглы — астаткі будынін ці, можа, нават і будынины былой сядзібы Ваньковічаў.

Яшчэ тады, даўно, стары неяк выпадкова выйшаў на край парка Чалюскінцаў. У тую мясціну мала хто дабіраўся праз парк — усе атракцыёны размяшчаліся бліжэй да праспекта. Там на краю парка на пагорку стары выпадкова знайшоў занядбаны абеліск, які сведчыў, што ў час вайны на тым месцы былі расстраляны людзі... І з таго ж пагорачка адкрывалася густа зарослая трыснягамі лагчына. З-за трысягоў ужо тады не было відаць і самога возера.

І стары пачаў шукаць гэтую мясціну, хаця ведаў, што пасля рэканструкцыі ўсяе Сляпянскае сістэмы, дзе канавы роўна выкладзены плітамі, дзе ўсё перайначана, не будзе ніякіх трысняговых абшараў.

Аднак старога вяло на тое месца, яму трэба было пабыць там.

Стары знайшоў той пагорак. На ім расла старая, раней у два ралы вярба. У камлі вярба была таўсценная, кара на ёй была быццам латы на колішніх воінскіх даспехах, аб'імшэлая.

Можа, ветрам ці снегам адно рала, відаць, было зламана ці скалечана. Таму даглядчыкі парку адпілавалі яго, і вярба засталася жыць, магутная, раскошная, пацяху зарубоўвала адпілаванае, і атрымалася жывое крэсла. Стары прымераў яго. Якраз падыходзіла. І ён не-не ды і пачаў прыязджаць да гэтае вярбы, утульна ўмошчваўся на вярбовым крэсле, клаў рукі на кіёк. І зімовае сонца нават крыху прыгравала твар, і калі заплюшчыць вочы, то пачынала хваляваць, пераліваца трысняговымі мяцёлкамі цэлае мора, і чуцен быў яго шэпат, такі прыемны і такі чаканы...

Так старога і знайшлі выпадковыя лыжнікі. Ён сядзеў, паклаўшы рукі на кіёк, спакойны і лагодны. Лыжнікі ледзь прайшлі далей, толькі спахапіліся, што сляды да вярбы ўжо даўно закіданы снегам і снег некранута ляжыць на чалавеку...

Будзе ўсё наадварот



Алена ІГНАЦЮК

Не! Супадзенне

*З сабой — не супадаю.
З табой — не супадаю.
Не супадаю з целам
і голасам сваім…
З мінулага — сябрамі,
з выявай коткі ў раме…
Не супадаю нават
з часопісам тваім…
Мае несупадзенні
заўважаць святлацені,
святыя дні нядзелі
і белы верталёт…
І спраўдзяцца падзеі —
як воля для надзеі,
як пчолы нагудзелі
ў бліскучых сотах мёд.
Я супаду — з сабою.
Я супаду — з табою.
Як праляціць над полем
белы верталёт.
Ўяўлю — несупадзенні
рабамі на калені
ўпадуць перада мною
на скошаны асот…*

Дзень кароткі

*Нібы ў сне мы Евы-коткі —
я і муж мой… Дзень кароткі.
Толькі ж кіса ўсё мурлыча —
так лубочна…Можа, кічам…
Дзень за вокнамі — без гукаў…
Але будзіць Еву муха.
Свет —паштоўкай — як сюрпрызам,
дзе каханцы ёсць, дэвізы.
Котка лапкай, нават вусам…
рвецца ў сон зноў. Вось спакуса?
За кіпцюрык цягне Ева
мой манжэт і край каўнера…
Засталіся ў сне мы Коткі —
я, і муж, і дзень кароткі…
І так будзе да вячэры…
А там грукнуць-скрыпнуць дзверы.
Нехта нас такіх разбудзіць…
Можа, цень, што ў доме блудзіць?*

Мой голуб

*Мой голуб задуменны… Веснік шчасця.
Няўжо твой лёс мяне акальцаваў?
Па свеце лётаў… Дожджык вочы засціў…
Анёл твае надзеі цалаваў.*

*Мой голуб белакрылы… Дорыш веру:
бы там, высока ў далях, незнарок,
як споведзь харастра, закон і меру,
вучыў ты Богам дадзены урок.*

*Мой голуб залацісты для багацця.
Па кропельцы, па сонечнай расе —
гнязды звіваеш, ладзіш свае шчасце.
Галубка — я. Пяць кольцаў на назе.*

З Новым Рокам!

*Студзень судзіць…
Людзі блудзяць,
нібы ў лесе, ў сваім лёсе…
Дрыжаць зоркі на марозе.
Ўслед за снегам і завеяй…
Нібы ў лета Макавея
пойдуць коткі і сабакі…
Снегіры ляцяць — як знакі
бяспрытульнага жыцця…
Да знямогі, забыцця —
ў маім лесе ходзіць»Йеці»
і губляе крык свой недзе…
Ў маім лёсе, так здалося,
ўсе сустрэчы — у двукоссі…*

*Мне б да зоркі прытуліцца…
Гучным спевам…Нават зрокам?
Я пачну за ўсіх маліцца
бяспрутульных… З Новым Рокам!*

Навагодзіцца!

*Ранак хворыцца, неба хмурыцца…
«Навагодзіцца!»– ўскрык Зімы.
Атрыбуты ўсе маёй вуліцы
расфарбуюцца ў тон хурмы.*

*Зіма — адліжная…
Паліца кніжная — іканастас!?
Ўся чырванее створка ніжняя —
нібыта вішнямі прапах мой час.
Анёл жа вуснамі кране блакітнымі
слязу маю… І распагодзіцца!?
Як вішні смак… Як ем павідла я…
пад спеў Зімы: «Ой, навагодзіцца!?»*

Дакрануцца да няўлоўнага

*Дакрануцца да няўлоўнага…
Нядзелю — зблытаць з серадой…
Дзве хвіліны для бясслоўнага
позірку майго на той
бела-белы свет… Адзначаны
снегам і сустрэчай страчанай
(нібы вымерз акіян!!!).
Дзве хвіліны — і мяцеліцца
сілуэт твой… Няўжо дзеліцца
дзень на мой і твой падман?*

*Дакрануцца да няўлоўнага…
Хоць мае сляды няроўныя…
Як вярнуць цябе, скажы?
Ветры пазаву духоўныя
і снягі блакітна-зорныя,
і развагі бездакорныя…
Дзве хвіліны… Для душы.*

*За далёкім-блізкім горадам,
аватарам — ты… Не верыцца!?
Дзве хвіліны. Грэюць холадам —
сілуэт твой… і мяцеліца…*

Свет ружова-бела-белы

*Чысты, брудны,
паласаты…
Непадсудны. Вінаваты.
Урачыста-навагодні!
З кіламетар ад Гародні…*

*Бачна барыню ў карэце
(вочы — кветкавае поле).
Па якой такой прыкмеце
кучар — снег? І сталі коні…*

*Можна барыню суцешыць.
Да тэатра ў час давезці…
Араторыяй заснежыць
гарадзенскае прадмесце.*

*Ўсё шукае (нібы ў ролі)
Марту-барыню ў карэце
Тызенгауз… граф Антоні.
Ў горад рвецца злосны вецер.*

*З кіламетар ад Гародні
Снег — як дзіўнай пасцілой,
нібы казкай навагодняй —
Марту заманіў. У свой…*

*Свет… ружова-бела-белы…
Ля гасцінца — паласаты…
Непадсудны.
Вінаваты…*

Судны дзень

*Цішыня — адна сусветная.
Судны дзень чакае — бедная…
Мо, праз тыдзень які — з'явіцца
(у чацвер, а можа, ў пятніцу)
навальніца — адпаведная.*

*Лісце шоргатам стараецца
дакрануцца (можа, ў пятніцу)
да аорты індыка.
Той імкнецца да чырвонага
андарака майго новага.*

Перад намі Талака!

*Штось пяе, як безгалосая…
Ў танцы рыжым яна — босая…
Ды за голас мой чапляецца…
Мо, праз тыдзень які — з'явіцца
навальніца… Мне — з пагрозаю…*

*Вецер гойсае, і куражыцца
(у чацвер, а можа, ў пятніцу)…
Дажджу ніць схапіў бясконцую…
Так памадна-тлуста мажацца
вуснаў шэпт маіх:
«За сонцам я!».*

Будзе ўсё наадварот

*Будзе ўсё наадварот…
І з канца пачнецца год…
Будзе тое — будзе гэта…
Мо, Рамэо і Джульета
зыдуць з іншага сюжэта…
Замест сёння будзе заўтра.
На матыў Камю ці Сартра
не ўявіць больш чалавека…
Замест турмаў — толькі Мека!
Бліснуць скура дзіў-гадзюкі…
Аднаўлення прагнуць гукі,
пахі, колеры і смакі…
Замест ружы сняцца макі,
што ў Маціса… Ці Ван-Гога?
Будзе так!?
Па волі Бога!!!*

Людзі-профілі

*А навокал мяне твары-профілі —
быццам з фрэсак Егіпта зышлі…
Якіх царстваў пагрозу адолелі?
І цяпер — сваю нішу знайшлі…*

*То на тронах сядзяць — фараонамі.
То на птушак палююць — вяльможамі.
То рабамі, што б'юцца пакланамі…
Хто танцоркаю… З флейтай і грашамі.*

*Але вокам адным павярнуліся —
у анфас, бы вякі азірнуліся…
У стагоддзі маім людзі-профілі
раўнадушшам прастор абязмовілі.*

*І навокал мяне твары-профілі…
Яны ў Пінску, і ў Брэсце, і ў Ковелі…
Яны мару маю заняволілі…
Суддзі, лоўчыя…Толькі профілі…*

Як дабегчы…

*Нам гадоў, можа, сорак ці больш…
«Завялі» нас —
бяжым — не спыніцца.
І чапляюцца вейкі за дождж.
Мы бы ў сне, які сам сабе сніцца.*

*Як дабегчы да той паласы,
дзе ралля галаву уздымае…
Дзе паклоняцца дню каласы…
За «цік-так» мы бяжым — паспяваем.*

*Разам мы…У адным ланцугу.
Не адчуць, што ланцуг разарвецца.
«Я да сэнсу дайду… Я змагу!» —
б'ецца ў кожнага з нас моцна сэрца.*

*Праз хвіліну, гадзіну ці год…
Прыпыняемся мы — і чакаем:
як жыццёвы міне галалёд,
пабяжым за густым небакраем.*

*А гадзіннік «цік-так»…
Штось не так…
у заведзеным сном механізме…
Разам стрэлкі адпалі — то знак:
мы бяжым ў нікуды…І павіслі
у бяспамяцтве, нібы павук
абляпіў, як нудой, павуцінай
нас ад вуснаў гарачых да рук…
Мы ў палоне ўсе зніклай хвіліны.*

Валошкавы луг не знікае

Рыгору Барадуліну

*Вочы — вадою вушацкіх азёр…
І ўкрыжавалася думка:
дзень верхалінамі дрэў — нібы твор —
рвецца да неба ў малюнках…
Лікі Радзімы — Маці-Мадонны
ў сінім валошкавым квеце…
Бы цар Давід такім днём паланёны:
ўчуў аб вушацкім паэце…
Разам псалмы праспяваюць да ранку…
Дзіўна трымцяць дзве душы матылямі
над гаманлівым разбуджаным ганкам…
Песню вітае нядзелька святая!
Расфарбаванае сонцам яечка —
як на іконе — у тэксце паэта
коціцца німбам… І на краечку
верша — радкі аднаго запавету…*

*Маміна слова малітвай за мову…
Для пагасцінца, які адчувае:
выйдзе з вушацкага лесу да дому:
ў небе валошкавы луг не знікае…
Анёлы ў бяседзе, а ён збоку недзе…
Як голуб на жэрдцы каўчэга…
Давідава арфа пяе аб паэце…
І маміна мова
над дрэвамі —
рэхам…*



Шчасце быць... у Visby

Ала ПЕТРУШКЕВІЧ

Перад тым, як быць...

Вы любіце свой дзень нараджэння, падарункі? Я — не. Відаць, ліміт маёй любові закончыўся ў дзяцінстве, калі гэты дзень заўсёды быў святам з ягоным поўным антуражам. Але апошнім разам атрымала падарунак, які выпадае толькі аднойчы. Якраз у мой дзень на схіле зімы ў Гародні прызямліліся Пятровіч-Пашкевіч і прапанавалі мне мару пра Visby.

Напэўна, усе, хто чытаюць нашу перыёдыку, сустракалі водгукі пра гэтае места ў вершах, эсэях. Гэты нянаскі тапонім сёння ўжо вобраз, які стала ўпісваецца ў найноўшы літаратурны кантэкст. Нават спроба з'явілася падыскутаваць, як гучыць назоў адпаведна нашаму вымаўленню і што трэба напрыканцы пісаць. Але ці варта падаваць кірылічны адпаведнік? Не стасуецца гэтае слова з кірыліцай.

Уяўляючы, што Visby — гэта Рай, гэта адно для абраных, нават марыць пра яго не смела. Але шчасце ў жыцці ўсё ж бывае.

Ружы між камянёў

Гэта было першае, што кінулася ў вочы. Як радасна мне сустрэць іх тут. Ледзьве не ля кожнага маленькага дамка і вялікага дому літаральна з каменняў уздымаюцца шыкоўныя кусты белых, ружовых, жоўтых і чырвоных ружаў. Апошнія — блізняты маім, што ля зарыцкага ганку. Толькі там яны ўжо адцвілі, а тут у самай красе.

І нават калі б мне стала невыносна сумна між чужых людзей, якіх не разумею, і гэта ўзаемна, мяне б выратавалі ружы. Але так стаць проста не магло.

Між іх не чуюся адзінокай.
Visby — горад ружаў.
Гэта вядома.
Але лепш гэта бачыць.
<...>

Каменнае сэрца Visby

Усё тут каменнае. Вельмі добра захаваная каменная сцяна (тры з паловай кіламетры) з высокімі і не вельмі вежамі. <...> Сцяна велічна (нават там, дзе развалiны) узвышаецца вакол старога горада. А для сядзібаў на некаторых вулках, што збудаваны паралельна ёй, служыць плотам з тылу. Уяўляеце, плот з сярэднявечнай сцяны? З каменю большасць дамоў (сустракаюцца і драўляныя). І — брукаванка. Мы, гарадзенцы, вельмі любім сваю брукаванку. Такой прыгожай тут няма. Праўда, наша зусім юная ў параўнанні з тутэйшай. Ды і засталіся ад яе толькі аскепкі. Тут, у старым горадзе, усе дарогі забрукаваныя. І ходнікі таксама. Даўняю парою, вечным каменем, які служыць месцічам вось ужо многа стагоддзяў, з любоўю выкладвалі майстры розныя ўзоры. То роўнымі радочкамі з прадаўгаватых або квадратных камянёў, то шахматным парадкам, то роўнымі кругамі. Асабліва хораша, калі разыходзяцца плаўныя фальбоністыя разводы, каб ізноў сысціся. А месцамі проста густа парассыпаныя рознакаляровыя, рознага памеру прадаўгаватыя камені, якія вельмі падобныя да цукерак — марскіх каменьчыкаў. Па такіх нязручна хадзіць, таму абавязкова ці пасярэдзіне, ці з краю выкладзены роўныя сцяжынкі з прастакутнічкаў. <...>

Сам горад збудаваны на вялізных каменных сходах, што ўзвышаюцца над морам. Вуліцы бягуць уніз, а ад мора лёгка ўздымаюцца ўгору. Аж на тую Kirkberget (Касцельную гару), якая таксама каменная, дзе месціцца наш Цэнтр. Яна нават і не гара, а стромая скала, абрыў, да якога падысці страшна.

І мора тут каменнае. Берагі і дно пры берагох, а мо і далей, усыпаныя і вялізнымі валунамі, і іх дзеткамі рознага ўзросту і росту. Паміж пірсамі — каменная выспа. Маленькая. Мо з дзясятак метраў у дыяметры. Напэўна, сцягнулі ў адно месца каменне, калі пірсы будавалі. Убачыўшы першы раз з берага, падумала: як гэта да яе дабрацца. Гляджу, а там дзеці. Глыбіня крыху вышэй за калена. Як брод перайсці...

Калі на каменныя муры свеціць сонца, яны становяцца цёплымі і пяшчотнымі. Шторазу, як хіліцца к вечару дзень і даўжэйшымі робяцца цені ад камяніцаў (не плагіячу, проста думаю вершамі), ідучы ад мора, дакранаюся рукою да сонечных аплікацыяў на суровых каменных сценах, і заўсёды яны ласкава дзеляцца са мною сваім цяплом.

Каменнае сэрца Visby добрае да тых, хто палюбіў яго.

Sankta Maria

За маім вакном (келля №3) касцёл Sankta Maria — храм XIII стагоддзя. Цуд. Як усе святыні з тых далёкіх часоў. Праўда, мне не надта пашанцавала: якраз гэтае крыло яе прыбралі ў карункавае павуціння-рыштаванне, абцягнулі сеткаю колеру марское хвалі. Любуйся! Любуюся. Вежамі, вольнымі ад тых убранняў, што нагадваюць шахматных каралёў з багатай калекцыі, купаламі, залатымі пеўнямі. Яны ўздымаюць мой зрок да неба, і мне, як Ірыне Багдановіч год таму, Святая Марыя «ў вочы глядзіць купаламі, / А я — на Яе і на мора гляджу задумёна...»

А неба — адно. Тое ж, што і над маёю Гароднéй. Светлае і сонечнае. Калі ж хмарнае, аплывае дажджом, малюся:

Хмары над Visby плывуць,
даляціце да Зарыцы, хмаркі,
і ападзіце дажджом
на мае прызавялыя кветкі...

Адна царква на ўвесь стары горад, а на нядзельнай месе вернікаў вобмаль. Дзіўна мне. А мо таму, што людзі і так жывуць у Раі. І нічога больш ад Бога не хочуць. Бо прыходзім часта да Яго ў патрэбе, у няшчасці. І не заўсёды спяшаемся выказаць удзячнасць за тое, што маем. Мне ж ёсць за што і дзякаваць, і чаго прасіць.



А служба такая ўрачыстая, такая велічна-прыгожая. А галасы святароў! Нібы раскаты грому. Толькі ў царкве адчула прыгажосць гэтае мовы. Бо на вуліцах яна гучыць зусім інакш.

Гадзіннік у Sankta Maria

«Гадзіннік у Sankta Maria спявае гадзіны». І нат паўгадзіны. І не проста спявае. Нагадвае мне: час твой у Visby сплывае, запоўні кожны дзень, кожную хвіліну, каб не зяялі пустэчай. Стараюся. Уважліва гляджу на гэты горад з мінулага, спрэс антыкварны, і такі блізкі, бо пазнаю ў ім і сваю Гародню, і свой Навагрудак, і ранейшыя Карэлічы. Ды і вясковыя шчонаўскія драўляныя хаткі пазнаю. Праўда, у нас ніколі не было такое прыгожае гонты. Нікуды не спяшаюся, шукаю суладдзя з сабою. Слухаю мора. Размаўляць з ім, праўда, не ўмею. Але ж для кабеты значна важней умець слухаць. Гляджу, як хаваецца сонца за морам. Маем мы дома такую мажлівасць?.

Звон плыве над усім местам. А мо над усім Готландам?

У мяне ж прад вачыма наш гарадзенскі гадзіннік на белай птушцы — Фары. Чую, як Юрка Голуб чытае свой трыялет:

Гадзіннік на Фарным касцёле
Не лічыць спазненне за грэх.
І хоча чаканне сагрэць
Гадзіннік на Фарным касцёле.

Наш не спявае. Толькі паказвае час. Падказвае гарадзенцам: спяшайцеся жыць. Альбо: прыпыніцеся хоць на хвіліну, куды вы спяшаецеся. Прысядзьце на лаўку...

Цікава, ці пішуць тутэйшыя паэты пра гадзіннік у Sankta Maria?. Пра сам горад — так. У бібліятэцы, якую не стамляюся вывучаць, знайшла цэлую паліцу з кнігамі пра Visby. Найбольш фотаальбомаў, дзе прыгожыя, вельмі якасныя здымкі паказваюць гэты край ва ўсёй ягонай велічнай і суровай красе. Ёсць тут і анталогія мастацкіх твораў, між якіх і паэтычныя. На жаль, не валодаю дарам, як мая непісьменная бабуля, чытаць на недасяжнай мне мове.

А яшчэ было цікава: гэты звон дорыць месту толькі нейкі механізм, аўтамат ці калі-небудзь радуе ўсіх талент музыкі. Дапыталася. Калі не проста звон абвяшчае гадзіны, а гучыць музыка, то гэта міні-канцэрт нябачнага маэстра.

Мая лаўка

Тут ужо шмат майго: келля, месца на пляжы і за сталом у сталоўцы, філіжанка. Ды і шмат яшчэ чаго. Бо заўсёды была хутаранкай, аднаасобніцай.

І каля гарлачыкавага стаўка ёсць мая лаўка. Прыходжу аднойчы, а там вікінг рассеўся. І побач свайго каня металёвага (ровар) паставіў. Села здалёку і замаўляю-гіпнатэзую: бяры свой пляцак, сядай на ровар і едзь. Паўтараю ў думках, навязваю яму сваё. Паціху кранаецца рука, кладзецца на пляцак. А я ўсё шапчу. Павольна ўстае, ад'язджае. Мая лаўка вольная...

Недарэмна ж я ўнучка бабулі-знахаркі.

Мова

Дзве тут асноўныя: шведская і ангельская. Усе ведаюць. А ў мяне, да сораму, з гэтых дзвюх па два словы. Толькі нямецкая, але добра-такі прызавялая, дваццацігадовае даўнасці. Пасля апошняга экзамену за незапатрабаванасцю ў архіў памяці здадзеная. Пані Мар'я Тальгрэ, пісьменніца, журналіст з Стакгольма, з якою мы па-нямецку якраз і размаўлялі, суцяшала мяне: мая нямецкая намнога лепей за яе рускую. Праўда, мова гэтая неяк хутка пачала ажываць, усё новыя парасткі пускаць, хоць зернейкі засохшымі былі.

Спачатку хадзіла з размоўнікам. Прачытаю пытанне, а адказ не разумею. А пасля пакінула. Што тут невядома: куды ні ідзеш, выйдзеш, куды хочаш. І вырашыла размаўляць з імі па-беларуску. Бо толькі з адное нагоды і звярталася, каб сфатаграфавалі. Працягваю фотаапарат, ветліва прашу па-нашаму і паказваю на сябе і фон, на якім увекавечана быць мушу. І неаднойчы ў адказ казалі мне па-руску. Расейцы, якія ў Скандынавіі жывуць стала. Тут яны зусім іншыя, нашу мову разумеюць. Не тое, што ў Беларусі. Пэўна, скандынаўскі клімат іх цывілізуе. Людзі, нібы тыя каляровыя шкляныя аскепкі, што часта мільгаюць ля мора між галькі, такія ж скругленыя, адшліфаваныя, цалкам бяспечныя. Толькі колер і захавалі. Так і чалавек, калі ўжо трапіў у чужы Край, мусіць стацца ў ім сваім, каб не раздвойвацца, каб аддзячыць, што і цябе ж тут прынялі. Але колер не мяняць. Напэўна, усюды так. Толькі не ў Беларусі. Напэўна, усе так. Толькі не кітайцы.

А вось тыя, што прыязджаюць са сваёй Масковіі, такое выдаюць, што проста словаў няма. Прыпыняюцца на вулцы, дзе такія прыгожыя, такія мілыя, такія нашы дамкі, зручныя, утульныя, усе ў ружах. Адзін тыцкае пальцам і з пагардаю кажа: «Какое старьё! Они же тут ничего не перестраивают». Расейцы, яны і ў Visby расейцы. Паспрабавала праснуцца ўва мне крыўда, быццам абразілі маё асабістае, такое дарагое. Наша спрадвечная беларуская крыўда! Але даўно навучылася ставіцца да такога паралельна. Не, не ў тым новым сэнсе — «абыякава», а разумеючы, што жывем мы з імі ў паралельным свеце. І не мусяць гэтыя светы перасякацца, бо нічога добрага з таго не будзе. І нічога ім не сказала яшчэ і таму, што ведаю, як недарэчна выглядае кабета, якая штосьці адстойвае, штосьці даказвае...

Па-руску гаварыла са мною і мілая пані з Літвы, што з сям'ёю прыехала на Готланд на адзін дзень. На сваёй яхце. Вельмі проста. Як далёка нам да Літвы! (Ад нашага лецішча 20 кіламетраў...)

Толькі ні разу ніхто не адказаў мне па-беларуску. Чаго захацела...

Калі ж яны ў мяне нешта пыталі, ветліва казала: «Хацела б Вам адказаць, але толькі адзін чалавек у Вашай краіне зразумеў бы мяне — Стэфан Эрыксан». І іншыя варыянты на гэтую тэму...

Так і разумеліся. Вельмі нават няблага. Комплекс моўнае непаўнавартасці даймаў мяне не вельмі настойліва. Бо за кожным словам і без іх — усмешкі, усмешкі...

Усмешкі

Людзі табе, чужаніцы, прыязныя дораць усмешкі. Зрэшты, хаджу тут паважнаю госцяй, нібы каралевай з далёкай краіны ў кароне з саломкі, якую сплялі мне дзіцячыя ручкі са школы ў вёсцы на шляху паэткі Алаізы Пашкевіч...

Выключэнні з гэтага агульнага ўсмешлівага правіла бываюць. Да прыкладу. На пірсе. Вузка, не размінуцца. Твар у твар з трыма асобамі. Міжволі ўсміхнешся. А ў адказ першыя дзве (кабеты майго веку) праходзяць з каменнымі тварамі. І толькі трэцяя, дзяўчынка-падлетак, міла сцвярджае правіла: людзі тут прыязныя, умеюць дарыць усмешку і незнаёмым. Дзякуй, дзяўчынка. За тое, што ўсмешка твая на твары маім адбілася. І засталася.

Дарэчы, якраз кабеты майго веку ўсміхаюцца найменей.

Беларуская палічка

Не надта багатая. Але ёсць у бібліятэцы Цэнтра. Пра тое прачытайце ў эсэ Уладзіміра Сіўчыкава. І пра кнігу запісаў. І не забудзьце глянуць на старонку 90, дзе Васіль Быкаў пакінуў цвяток Радзіміы васілька. У вершы Валянціны Аксак прачытаеце:

Ён прыязджаў сюды тройчы
і столькі ж маркоціўся —
не знаходзіў
сваю каханую
ў суквецьцях красуняў
з цэлага сьвету.

Таму і намаляваў. Я таксама шукала. Знайшла. На каляровай фіранцы між чырвоных макаў і белых рамонкаў у вакне аднаго з дамкоў недалёка каля Батанічнага саду.

Вось жа, на нашай палічцы тамы Васіля Быкава, кнігі Валянціны Аксак, Уладзімера Арлова, Анатоля Сыса, Франца Сіўко, Сяргея Дубаўца, Андрэя Хадановіча, Альгерда Бахарэвіча, Анатоля Івашчанкі, двухтомнік «Беларуская літаратура і свет», выданні Сіўчыкава, «Дзеяслоў»... Прывезла некалькі з Гародні. Спадзяюся, «Апошні дзень» Анатоля Брусевіча дачакаецца тут сустрэчы з аўтарам. Анатоль пра гэта не ведае. На тое найперш і везла. Бо веру, што між кнігамі і людзьмі існуе прыцягненне.

Кніга падарожных эсэ Уладзімера Арлова дапамагла мне чарговы раз упэўніцца, што з гумарам у мяне ўсё не так і блага. Бо дома мой адзіны каханы шторазу, калі смутна мне становіцца ад анекдотаў, прачытаных ім з апошняе старонкі газетаў, катэгарычна заяўляе: «Гумару ты не разумееш!». Разумела не толькі дасціпны гумар нашага пісьменніка-вандроўцы, але і ягоны боль, ад якога беларусы не здольныя пазбавіцца ні за якімі межамі.

Здавалася, не прамінула ні аднае перадачы «Вострая брама» Сяргея Дубаўца. Аж не. Самых патрэбных якраз і не чула. Прысвечаных Наталлі Арсенневай. Сустрэлася з імі толькі тут, у кнізе. Праз дзесяць гадоў. Шкада, бо не згадала гэтыя працы ў сваёй манаграфіі пра паэтку. Якраз гэтым летам меркавала паехаць у Доры, каб прайсці па яе слядох. Але ўсюдыісны Зміцер Бартосік і там быў. Пра гэта йшлося ў перадачы «Наталля Арсеннева. Доры». А прамінула іх, бо якраз у тым часе рыхтавала вечарыну да стагоддзя паэткі.

«Шчасьце быць»

Сустрэла тут кнігу Барыса Пятровіча, якую ў свой час таксама прапусціла, бо прачытала недзе ў анатацыі, што туды ўвайшлі «Фрэскі», а іх ужо чытала. Аказалася, гэта зусім іншая кніга, назва якое стала лейтматывам усяго майго жыцця ў Visby. Самым цікавым суразмоўцам тут і быў мне герой гэтае кнігі.

Увесь час збіваюся, каб штосьці пра яе напісаць. Але не, бо пішу пра Visby і пра свае паэтаў. А Барыс Пятровіч не мой аўтар. Імкнуся не блытаць жанры. Бо Visby не кніга. Хоць тыя, што маюць шчасце быць тут, напэўна, як і я, чытаюць яго вуліцы як радкі, старонкі вельмі цікавае кнігі. І ведаюць, што не прачытаюць. Бо шчасце быць у Visby вельмі кароткае, як усе шчасці.

Праўда, «Шчасце быць» — таксама не зусім кніга, бо ідавочна рассыпаецца на дзве. І я ніколі б не звяла іх у адно, як гэта зрабіў аўтар. Першую чытала са смуткам: наверх, на свет цэлы (праўда, свет не ведае ні нас, ні нашае літаратуры) выцягнутыя ўсе нашыя беларускія вясковыя загадкі-комплексы, пра якія беларусы (тыя, хто за іх гаворыць) згадваць пачалі сто гадоў таму. Але толькі кранаць, хаваючыся, нейкім адным слоўцам падказваючы, што сказаць хочуць. Самае далікатнае — патаёмнае. А тут усё адкрыта. Пэўна, прыйшоў час.

Другую чытала з болем. Бо свет у ёй (з усім тым штохвілінным, штокрокавым абсурдам, які так дакладна, падрабязна, нават смакуючы, як мазахіст свой боль, раскрывае пісьменнік, здзекуючыся нават з асноўнай ідэі, што ў назве) можна ж бачыць зусім інакш. Як шчасце быць. Без іншых, адваротных, сэнсаў. Не шукаючы, не выглядаючы і не выцягваючы на свет белы абсурд за абсурдам. Не ведучы чытача ў «Трызьненьнях» ад нерухомасці да яшчэ большае нерухомасці, ад цемры да яшчэ большае цемры, якая адно і ёсць шчасцем?. Але ж на тое яны і ёсць трызненні.

І яшчэ глыбей, больш балюча папацца ў даўно вядомым-забытым: жыццё як сон, я ёсць і мяне няма. Хто ўсё ж у нас першым гэта вывеў? Барыс Пятровіч тут пазначыў 1993 год. Валянцін Акудовіч выдаў сваю кнігу ў 1998-ым. А калі напісаў?.

«Піліпікі», што ў фінале, крыху раз'ясняюць змрочнасць «Версій» і «Трызьненьняў». Не можа не выклікаць усмешку тое, як пісьменнік прэпаруе свядомасць і падсвядомасць свайго Піліпіка (зразумела, Піліпа), маленькага чалавека, які проста жыве, круціцца. Бо інакш тут не выжывеш. Суцэльныя анекдатычныя сітуацыі для яго норма. І сам ён анекдот. Які ходзіць. І нават думае. І часам цытуючы вершы. Але, наогул, «Піліпікі» зусім не лёгкаважкае чытво. Такога і быць не магло пад вокладкаю «Шчасьце быць...» А запачаткавана ў нас такая літаратура ў новым часе сто гадоў таму Вацлавам Ластоўскім, ягонымі «Прыгодамі Панаса і Тараса». Праўда, там героі пра сваё з якім яшчэ гонарам! Бо лепшае ад чужога. Нягоршае. А тут ужо і не ведаюць, якое гэта, сваё. І ведаць не хочуць.

«Ружоўніца»

Як жа міла сустрэць мне тут гэтую кнігу. Так я пісала пра ружы, але нічога, бо і пра кнігу так. Бо адна ў нас з пані Валянцінай любоў — кветкі. Сусешыў яе эпіграф з Крыстыяна Бабэна: і мне заўсёды няёмка, бо ў кожнай кнізе пра кветкі. Якіх усюды выглядаюць мае вочы. І ў творах знакамітых гарадзенак: Элізы Ажэшкі, Алаізы Пашкевіч, Ларысы Геніюш, Данугы Бічэль...

Вершы — пяшчотна-журботныя імпрэсіі, дзе лёгкі водгук падзеі, калі прыходзіць успамін. Усё гэта: і набыткі, і страты — так гарманічна злагоджана, асветлена дабрынёй, жаноцкасцю, мудрасцю. Вельмі элеганцка, не губляючы годнасці, не зраніўшыся да крыві, умее яе гераіня абыйсці тое, што абыйсці трэба, каб застацца сабою.

У нас так многа падобнага. А гэта найперш вабіць у творах. Так, паэтка тлумачыць:

Распусьніца —
ад дзеяслова «распусьціцца»:
здольнасьць кветкі і жанчыны.

А я тлумачу студэнтам пра Купалаву Зоську: яна не блудніца, яна заблудзілася між людзьмі, якія не кахаюць, адно ненавідзяць. Яна таксама «распусьцілася», гледзячы на кветкі, жывучы між іх болей, чым між людзей, збіраючы іх на лузе ля рэчкі, вянок звіваючы, букет складаючы, каб аддаць Старцу, каб той памаліўся за... Памятаеце.

Так хочацца верыць, услед за паэткай, што паўторыцца і наш беларускі цуд (с. 45). Напэўна! Але ўбачым яго мы, відаць, ужо здалёку, звысоку.

Яе вольныя (не хоккаўскія, не вымераныя сіметрычна склады: 5–7–5) трохрадкоўі «Проста быць тут» так многа гавораць мне. Проста ставяць кропку:

Проста быць тут.
Тут проста быць.
Быць тут проста.

А я проста дабаўляю да кожнага радка адно слова — шчасце.

Як і паэтка, таемна звязу з Готланда не адну кветку. Ніякі гэта не крадзеж. А рассяленне красы.

У Visby мне было вельмі светла з вершамі Валянціны Аксак. З «Ружоўніцай» хадзіла па Батанічным садзе. Пра яго мусіць быць асобны аповед. Але не варта. Лепш чытайце нізку паэткі «Батанічны сад у Visby», а ў якасці нагляднага дапаможніка глядзіце здымкі на маім сайце.

Едрусь і Юра

А яшчэ я ў гэтым Раі размаўляю з Едрусем Мазько і Юрам Гуменюком. Пішу пра Едрусевы «Займеньнікі», шукаю іх зменныя сэнсы, а яны ўвесь час вядуць па адным шляху, да аднаго: праз каханне да смерці. Як жа ён прыцягваў яе! Неадвязная думка-мроя вярэдзіць мяне. Як усе нашыя думкі-памкненні: каб нешта вярнуць, адкінуўшы тое, што ёсць нязменным. Вось жа, той мой ланцужок, які ўвесьчасна закругляецца ў кола: чаму яго адзінай кнізе не з'явіцца раней, тады б ён прыйшоў у наш Саюз, як зрабіў тое ягоны апошні лепшы сябра Толік Брусевіч, і тады не мне, а яму прапанавалі б Visby, і тут ён бы ацалеў, яшчэ раз, усю канчаткова, перакана ўшыся, якая яна, адзінота, верная з тымі, каго абірае, ад яе тут паміраеш сто разоў і столькі ж уваскрасаеш. І не варта іншых ратункаў шукаць, а проста зразумець і прыняць назаўсёды, што шчасце быць — аксіёма, дадзенасць. І трэба яе засвоіць. І перастаць клікаць смерць. І ягонае сэрца вылекавалася б ад стомы, прагі ўсё і ўсюды паспець, не разбілася б аб гарадзенскую бруканку, бо ўбачыў бы ён, які моцны тут брук, грунт, на якім вырастаюць моцныя, здаровыя гаспадары тутэйшага краю. Аж свеціцца іх здароўе і сіла. А Едрусь сэрца здаровае мець не мог. Бо ў нашым Краі жыць і не пакутаваць нельга. Ён ніколі не прыедзе ў гэты Рай. Але тут я памятаю пра яго. І тут ягоная кніга, якая (чаму?) не з'явілася раней...

І пра Юру, які жыў у сваім тэатры, ствараючы яго ўсюды, дзе з'яўляўся. Сам выбіраў ролі. І свой апошні перформанс выканаў...

«Лео»

У шведскай пісьменніцы Маар'і Тальгрэ «Лео» — галоўная кніга, праца многіх гадоў, мастацка-дакументальная аповесць пра бацьку, эстонскага патрыёта, які быў забіты НКУС у 1944 годзе.

Гісторыя Эстоніі часоў Другой сусветнай вайны вельмі нагадвае нашу. Тое ж імкненне патрыётаў маленькае краіны выратавацца між схваткай двух агрэсараў, тая ж самаахвярнасць і тыя ж горы бруду, што былі вылітыя на іх савецкай прапагандай. У кнізе два галоўныя героі: адзін з кіраўнікоў эстонскага Супраціўлення Лео Тальгрэ і ягоная маленькая дачка, якая шукае бацьку. Праз многа гадоў, ужо нават стаўшы дарослай, застаецца той дзяўчынкай, ідзе па ягоных слядах, каб разабрацца, што ж было насамрэч. Яна вяртае сабе бацьку, смелага, шчырага, прыгожага і прыстойнага чалавека. Яна ачышчае ад бруду памяць пра яго.

Мо і не згадала б пра гэтую кнігу, калі б не знайшла ў ёй адну назву. Сябар Лео, які быў схоплены жывым, адбываў пакаранне ў Інце. Так, у тым лагеры, дзе пакутавала і наша паэтка Ларыса Геніюш. Тыя ж шляхі, той жа крыж. Але цалкам іншы фінал трагічнай гісторыі. Бо ў Эстонцаў усё гэта — страшнае мінулае. Бо над іх крайнай — нацыянальны сіне-чорна-белы сцяг...

Як на мамінай печы

Калі раптам хто з гараджанаў чытае мае готландскія абразкі, прапусціце гэты. Бо зразумець яго змогуць толькі тыя, хто вырас у вясковай беларускай хаце, дзе ў кухні вялікае месца займае печ, крыніца цяпла, мілы прытулак.

Даўно гэта страчана. Больш за трыццаць гадоў, калі перабудавалі нашую хату. Вялікая, утульная печ была для мяне зацішным месцам, дзе ніхто з наведвальнікаў за каляровую занавескай не бачыў малую дзяўчынку, адкуль, цікаўная да ўсяго, мела мажлівасць слухаць размовы з бацькамі. Часцей з мамай, бо бацька заўсёды быў заняты, нешматслоўны, ягоныя аўдыенцыі заканчваліся вельмі хутка. А мама была радая, як мне падаецца, кожнаму добраму чалавеку (нядобрых хіба і не было) у нашай хаце.

Печ грэла мяне, шчодра аддаючы сваё цяпло. Яна была маім працоўным месцам. Тут чытала кнігі, вучыла вусныя ўрокі. Шыла. Усё жыццё нешта шыю. Бацькава показка пра мяне: «Што мая Сора то шые, то пора?» А яшчэ любіла разглядваць здымкі кінаактораў, якіх мела вельмі многа. Бацька прывозіў са сваіх камандзіровак. Найлепшы падарунак. Ведала ўсе фільмы, у якіх яны здымаліся, гэтая інфармацыя была на адваротным боку. Да дробязяў магла згадаць знешнасць. Нават гульню прыдумала: па апісанні партрэта пазнаць актора або наадварот. Зразумела, заўсёды ў ёй выйгравала.

Калі заканчвала школу, бедавала: «Як буду ў тым горадзе без печы?»

Вось жа, у гэтым далёкім месце да мяне вярнулася мая маміна печ.

Людзі тут пачуваюцца вельмі вольна. Могуць прылегчы на кожным месцы, дзе расце трава. І на схіле Касцельнай гары таксама заўсёды нехта адпачывае. Ёсць тут тры каменныя прастакутнікі. Даволі вялікія. Метраў два на паўтара. Не ведаю, якая іх праўдзівая функцыя, але служаць яны людзям, каб прысесці, прылегчы. І ў сонечны дзень, нават халаднаватыя, нават калі вар'яцее ад злосці вецер, яны не проста цёплыя, а вельмі-вельмі цёплыя. Толькі б сонца свяціла.

А вось у маю келлю яно заглядвала толькі вечарам. Калі ж працавала гадзінамі за кампутарам, не рухаючыся, ногі вымярзалі да ледніковага стану. І тады ішла на сонца, вярталася на дзясяткі-дзясяткі гадоў таму. І грэлася на цёплых каменных лежаках. Выгравала ўсе свае косткі-суставы не горай, чым у найлепшай працэдуры ў санаторыі.

Дзякуй табе, Visby.
Мне тут было цёпла.
Як на мамінай печы.

Мае бірузовыя пацеркі

рассыпаліся па бруканцы Visby. Колеру марское хвалі. Так доўга шукала іх, каб пасавалі да завушніцаў, а завушніцы да пярсцёнка.

Збіраю іх між камянёў. І раптам разумею: рассыпаліся, кабператварыцца пад нагамі ў пыл і са снегам вясною сплысці ў мора. Бо ў яго тут няма гэтага бірузовага — колеру — марское хвалі. А што гэта за мора без колеру марское хвалі?

Не буду збіраць мае пацеркі.
Падару мору ягоную хвалю.
Каб хоць чым аддзячыць.
За шчасце быць.
У Visby.

Друкуецца ў скароце.

ВЫШЫВАНКА



Юр ІЗДРЫК

спецыі

*разнесены ветрам па розных паўшар'ях і
свету і мозгу і слова
спяваем мы сола
накручваем кола
вяслуем прытомлена квола
нуда, разувер'е — як прорва і бездань дзе
соладка так захлынацца
вось мір вам і мірра! —
мармыча настырна гандлярка цукровую
ватаю
ды мёд і алівы і шчасныя хвілі
ад нашага вока хавае
бо хоча ўсыпіць і вёслы схапіць
глыбокі спакой абяцае
бракованы мір заляжалае мірра
і навакаін ў какаіне
а перац інжыр цынамон ды імбір
цяжкая бадзяжная хімія
падроблены глёўкі прыхмелены свет
пагардай атручаны трункі
й выцягвае струны з артэрый і вен
злы геній сухіх пацалункаў
нам легчы на хвалю бракуе ўжо сіл
каб выграбці ў дэльту і ў мора
наснілася нам што ўжо мы назаўжды
у цемру начы замураваны
і сшэрхла кара замест ніжніх павек
навекі нам зрэнкі пакрыла
і твары як цынк
і зашкальвае ў пік
у перцы працэнт цыянідаў…
ты знаеш — усё гэта сну мільгацень
а хай утаймуецца лівень
і троіцай лета праявіцца дзень
як чэрвень як ліпень як жнівень
каб перамалоць і змяшаць у адно —
прыправу салёна-духмяную
і жар маіх спецый
і сола твайго хмельнага ўлоння
распаленага*

куц…я

*мак
мёд
арэхі
цукаты
і зерні што не прарастуць
яшчэ не паспееш даўгі раздаць ты ўжо ў
яму цябе нясуць
не важна — ў труне ў паланкіне
бо яма заўсёды яма
зямля мая мама
зямля панарама
зіма нармальная з'ява
а паранармальныя плодзяцца ў спальнях
накручваюць кола днесь
ды вольна легальна павальна вітальна
і ціха вальсуе смерць
бо помста — халодная ўдзячнасць —
гарачая
толькі нішто не ў цане
і так бестурботна і радасна плачуць
усе хто стаіць пры сцяне
а там за сцяною з новай цаною
нас зноў нехта перапрадасць
і зноў уцялесніцца моўчкае слова
у кроўю скраплёную масць
неперша на страту хто крыва хто
прама
мы пойдзем дарэмна за так
а следам за намі
пасыплюцца ў яму
арэхі
цукаты
мак*

вышыванка

*за што ні вазьміся — вузлоў блытаніна
заплецены сеткі прапушчаны вочкі
нядбала кагосьці прашыта між нітак
гладдзю ці проста звычайным
крыжыкам
сцяжкі нібы сцяжкі зацягнуты туга
ў мярэжу якой да карункаў бліжэй…*

*мой божа! мой божа! — крычыш яму ў
вуха
ды будзь жа ўважлівым ці асцярожным!
ды глуха ў бога і хтось безупынна
прадзе і гафтуе адно мешкавіну
і абярэгамі вабіць далёкі бераг
кожная сцежка — тонкая павуціна*

*без голкі нажніц апушкамі пальцаў
зубамі пазногцямі — хто ўжо як можа
нябачную нітку ад іншых адрозную
кожны распутвае… ну амаль кожны*

*дзяўчынка
каханая
мы ў цёмным свеце
дзе наспех імгненне прашыта накрыж
знойдзем сваю павуцінку светлую
хай не парвецца яна —
зазвініць*

утылізацыя

*не глядзі ў вочы мне — там сляпая адно
амальгама
лепей з'еш маё сэрца — там ёсць
вугляводы бялок
не ўдзявай маю скуру — яна
зашмальцована ў плямах
лепей вырві рабро і зрабі з яго файны брэлок
не чытай маіх слоў бо яны мне самому
чужыя
ды паслухай мой кашаль — глухі
тытунёвы даб
і з маіх пацалункаў карункі спляці залатыя
а душы не шукай — гэта даўна
раскрадзены скарб
паміраць яшчэ рана а жыць так далей
немагчыма
так прыўкрасна усё і нясцерпна жахліва
так
я б вельмі хацеў каб правіны ты мне
адпусціла
сам не знаю якія і цалкам няведама як
не глядзі мне у вочы не слухай не ідзі за
мною
а пабачыш здалёку благаю — хавайся
ўцякай
аж калі на вясну прарасту я духмяным
ляўкоем
назбірай майго цвету з мяне завары
сабе чай*

малітва

*калі паварочваецца свет спінай
і зноў паміж намі ростань і сцены
гавары са мною
гавары са мною
няхай нават словы нічога не зменяць*

*і калі ўжо навокал пахне вайною
і разгараюцца першыя бітвы
гавары са мною
гавары са мною
бо словам таксама можна любіці*

*адно толькі знаю адно я засвоіў
і прашу цябе ціха нязграбна нясмела:
гавары са мною
гавары са мною
і няхай твае слова станецца целам*

**Пераклад з украінскай мовы
Наталлі Русецкай**

Вечнасць сусветаў

Юлюс КЕЛЕРАС

* * *

*гэтаявосеньнашматдаўжэйшаязакаханне,
намзнаёмаепапахмурным
полагамветру, маўклівымзбянтэжаным
словам, штоправодзяцьлета,
штостомлена
ляжыцьнабяскаолерныммяску
апусцелагапляжа, забытагаўсімі,
акрамявартаўніка — загарэлагахлопца
зцыгарэтай, ёнрасцягнуўсяялодкі,
якаяпрынялавецер*

* * *

*Дзіцё назірае за ценем сваім
на старым гарышчы, дзе захоўваюцца
старыя,
пакрытыя пылам часопісы, пустыя
слоікі,
акуратна абарваныя календары
мінулых гадоў. Глядзіць дзіцё, нічога
не прамаўляе, пакуль нечакана
не засынае
на груваcткім бабуліным ложку,
на якім была зачатая яго мама.*

* * *

*там, дзе вусны твае дакраналіся,
засталося мора,
дакладней, соль, якая асела на пясок —
які матыў банальны і бессмяротны, але
ўсё роўна
мы не адмовімся, пакуль існуем…
тыя ластаўкі самотныя! і літары
яхтаў,
раскіданых па роўнядзі акіяну! о чыстае
святло!
гультаі — садовыя смаўжы — як мы з
табой —
не ведаюць нічога…*

Данатас ПЯТРОШУС

Спазнанне прыроды ў гісторыях навейшых часоў

*Пра Чалавека, яго ўнутранасці і
рэпрадукцыйныя функцыі — толькі ў
дзявятым класе;
датуль неяк трэба будзе вытрымаць
шчаціністую заалогію ў восьмым:
ад медуз да сланоў
і элефантаў. Уключна.
У сёмым класе ператварыцца ў цяля і на
вока
ператраўляць дрэвы, травы, кусты,
лішайнікі, імхі, грыбы, але не ўсе.
А чым ёсць спазнанне прыроды? Калі
сонца свеціць,
тады можна арыентавацца і ісці дадому.
Калі аблокі, значыць, заблукаў. Глядзі
на лішайнікі і імхі. Не панікуй. Не бяжы.
Каля бяжыш, тады левая нага
карацейшая —
кругамі, кругамі — у той самы бок, у
той самы час,
і настрой: нават і пахі тыя самыя —
вялікіх
негартаных восеньскіх кніг — сам
пачатак верасня дзеліць гісторыю
Навейшых часоў, але бачу адразу — ілжэ
— не новая
гэта гісторыя: у табель тры дзіцяці
ўпісана
і ацэненыя паводзіны, такім чынам,
у пачатку навучальнага году — в. добра,
у канцы — в. добра
у наступны год — зноў будзе в. добра —
пішыце што хочаце, мне не замінае: чым
далей,
тым хутчэй новае старэе
навейшыя часы скончыліся
у пазапазамінулым годзе: тады яшчэ ў
мяне была пара красовак,
я захоўваў іх у гардэробе, што не зачыняўся
нехта закінуў адзін у спортзале за сетку
пад паталком, што ахоўвала лампы ад удару
патрэбна было б выкалупаць, але дзе
возьмеш такую доўгую палку? —
у нас такія высокія дрэвы ўжо не растуць
быў у Ёдгірысе, правяраў становішча —
непраходная
камлістая моц — прыходзіш з сякеркай, лічы,
ты прапаў;
у падлеску — драбы
патрушчаных лесавозаў
і сельскагаспадарчай тэхнікі,
чарапы меліяратараў, акамянелыя
сляды калгаснікаў, што ўцяклі — тут
навейшыя часы
пачаліся вельмі позна, але доўга не
працягнуліся —
бабры і іншыя д'яблы забілі дрэнажныя
сістэмы,
зямля выбухнула як радыятары
ў культурцы ў нечаканыя сакавіцкія
маразы;
сядзеў, глядзеў старыя ўжо бачаныя
фільмы
цёмнымі вечарамі,
спутнікі нашай імперыі, што
не пілатуюцца
ўзляталі і згаралі без гуку
ў верхніх слаях атмасферы —
і неабавязкова ноччу:
бывае, што і днём ззяе
чароўнае святло, але не можаш
патлумачыць —
адкуль яно?*

Альвідас ШЛЯПІКАС

Верш да нараджэння сына

*загараецца месяц, плыве і палае, малады
немаўлятка расплюшчвае вочы, яго
зрэнкі — дзве чорныя багны
два сусветы, у якіх — увесь гэты дзіўны
свет, што так хутка старэе*

*на твары месяца з'яўляюцца маршчыны,
сівее яго полымя
дзіцё вырастае ў мужчыну і пачынае
думаць пра вечныя сусветы
пра бясконцы час, пра нішто, якое не
прыйдзе*

*месяц вее попел па ветры, ад яго
робяцца шэрымі
зрэнкі мужчыны, слепнуць сусветы, знікае
дзіцё, сагнуўшыся ў старога, кляне гады
свае і слепату*

*сыходзіць, свята верачы ў маладосць
месяца, у вечнасць сусветаў*

Вясна. Усё больш святла

*калі добра ўслухваюся далёка за некалькі
сценаў чую радыё
яно заглушае мяне
лічыць загінулых з чужога войска
хлопчыкаў і нічога*

яны не мелі імёнаў

*пачынае спяваць хрыплым гартанным
голасам выць імітаваць
жанчын што галосяць
я слухаю усё больш знікаючы чакаю цябе
калі выйдзеш
з балкона кухні
з па-бухгалтарску яснай геаграфіі ў якой
ніхто
яшчэ не быў пахаваны жывым
дзе ніхто не выціснуты
рассечаны кулямётнай чаргой*

*выходзіш
пахнеш жавальнай амерыкай уключаеш
час
пачынаеш жыццё яшчэ раз нанова напаўняеш
пакоі ціканнем
раскрываеш шторы і нічога не адбываецца
ніякай шалёнай кулі
ніякага свінцу
ніякага далёкага гартаннага голасу што
загадвае адступаць*

**Пераклад з летувіскай
Сюзанны Паўкштэла**

«Для Айчыны мілая смерць, шрамы і кайданы...»

Палонныя беларусы «польскай службы» ў 1812–1815 гадах

Анатоль СЦЕБУРАКА

Не сціхае дыскусія аб характары вайны 1812 года для Беларусі, што выяўляецца ў зацятых спрэчках аб яе «айчынным» характары. Далёка не ўсе праблемы асэнсаваныя з нацыянальных пазіцый, сярод якіх існуе і праблема ваеннапалонных.



Іларыён Пранішнікаў. «Французы ў 1812 годзе, паланёныя партызанамі»

Дзесяткі тысячаў ураджэнцаў Беларусі служылі ў войску Герцагства Варшаўскага і Літоўскім войску. Беларусы «польскай службы» разам з Напалеонам прайшлі «Рускую кампанію 1812 года», адступалі праз Польшчу і Германію да Парыжа, згубіўшы забітымі і палоннымі пераважную большасць асабовага складу.

У Расіі засталося ледзь не дзвесце тысячаў жаўнераў «Вялікага войска», але ўласна французаў сярод іх аказалася не так і шмат. Гэта была вялікая інтэрнацыянальная група, якая складалася з амаль усіх еўрапейскіх народаў. Сёння ніхто не бярэ на сябе адказнасць назваць дакладную лічбу палонных, не кажучы канкрэтна пра палонных палякаў. Нас жа цікавіць яшчэ больш складанае пытанне: якую частку з іх складалі этнічныя беларусы і які іх далейшы лёс.

Войска Напалеона ў 1812 годзе налічвала амаль сто тысячаў польскіх жаўнераў. Пад час адступлення з Расіі тысячы палякаў трапілі ў рускі палон. Нават рускія гісторыкі пагаджаюцца з тым, што «...*судьба поляков оказалась более трагичной. Отношение к ним во многом было не как к солдатам армии противника, а как к государственным преступникам, поэтому можно говорить о политике национальной дискриминации поляков» [С. Н. Хомченко, Отечественная война 1812 года: Источники. Памятники. Проблемы. — Москва, 2006].*

Згодна з цыркулярам ад 16 студзеня 1813 года, акрэсліваліся падыходы да вызначэння нацыянальнасці палоннага паводле прынцыпа «дзе ён служыў, а не дзе нарадзіўся»: «*вообще наблюдать, чтобы пленные различаемы были не по нациям народным, а по нациям войск; например, итальянец, служивший во французских войсках, должен быть показан в линейке французов, а не итальянцев*». Як трапна адзначыў В. А. Бяссонаў: «*Следовательно, в числе польских пленных могли оказаться лица, по своему происхождению не имевшие никакого отношения к полякам*».

Ці былі сярод ваеннапалонных беларусы? Натуральна, так. Але ў тагачасных дакументах па ўжо акрэсленых прычынах іх не магчыма сустрэць. Беларусы «растварыліся» сярод польскіх вязняў...

Пад час французскай акупацыі Беларусі з мясцовага насельніцтва было сфарміравана шэсць палкоў пяхоты, полк «літоўскіх» стральцоў, полк лёгкай коннай гвардыі і мясцовая жандармерыя. Напярэдадні вайны шматлікія ўраджэнцы Беларусі па ўласнай ініцыятыве ўвайшлі ў войска герцагства Варшаўскага.

Што ж чакала палонных беларусаў «польскай службы»? Усе яны пераводзіліся на Каўказ альбо ў Сібір. Зборным пунктам для сібірскай высылкі быў абраны Ішым Табольскай губерні. Туды накіроўвалі вязняў вайны, якія ўжо былі ў Арэнбургскай, Пермскай, Вяцкай, Пскоўскай губернях. Але большасць трапляла на Каўказ у вайскова-працоўныя інжынерныя каманды, якія ўмацавалі берагі Церака.

Першае распараджэнне аб іх высылцы з'явілася яшчэ 22 кастрычніка 1812 года. Гэты працэс быў толькі часова перапынены цыркулярамі ад 24 снежня 1812-га і 28 студзеня 1813 года, але пазней зноў аднавіўся. Першыя з палонных трапілі ў вызначаныя палкі 19 і 20 дывізій рускага войска на Каўказе і ў Грузіі.

Дзякуючы працы рускага даследчыка А. А. Магерамава «*Военнопленные «Великой армии» на службе в Сибирском линейном казачьем войске*», апублікаваныя спісы палонных палякаў («польскай службы», «польскай нацыі», «польскай губерніі»), якія пасля вайны былі залічаны ў Сібірскія казацкія фарміраванні. Не складана зразумець, што размова ідзе і аб палонных беларусах «польскай службы» (аўтар піша: «*Поляки составляли особые команды казаков литовского списка*»). Кім былі тыя палякі? «*Небольшое их количество происходило из бывшего Великого княжества Литовского — несколько раз упоминается Виленская губерния, изредка встречаются Белосток, Полоцк, Гродно*». У 1814 г. абсалютная большасць палонных з Лінейнага Сібірскага казацкага войска вярнулася на радзіму, але частка асела ў Сібіры.

Адносіны палонных з мясцовай сібірскай адміністрацыяй і насельніцтвам былі напружанымі. Часта ўзнікалі непаразуменні і канфлікты, звязаныя з тым, што вязні трымаліся разам і не жадалі ісці служыць у рускае войска ды прысягаць цару, рыхтавалі пераходы да кіргізаў, спрабавалі ўцякаць з Каўказа ў Персію да французскіх эмісараў. Супрацьстаянне павялічылася ўлетку 1814-га, калі з Сібіры пачалі адпускаць афіцэраў, а шараговых да часу пакідалі ў гарнізонах. Архіўныя справы захавалі шэраг звестак аб тым, што яны рыхтавалі бунты і ўцёкі («*в Ишиме одна партия в 250 человек собиралась «уйти к киргизам», лишь бы избежать русской службы»; «от послушания в службе не только отказались, но утвердили и впредь никогда не повиноваться»*) [*Б. П. Миловидов. Военнопленные поляки в Сибири в 1813–1814 гг.*]. У прыватнасці, змова палонных у Томску выклікала занепакоенасць у сталіцы імперыі, і яе разгляд зацягнуўся да 1817 года. У выніку сорак палонных панеслі розныя пакаранні, а частка з іх атрымала вырак на працяг высылкі і, адпаведна, засталася ў Сібіры.

Сёння прынята лічыць, што на паўночным Каўказе было 10 тысячаў палонных палякаў (1813 год — 8643 чал., 1814-ы — больш за 9000.). Ці былі сярод іх палонныя беларусы? Безумоўна. Напрыклад, у 1912 годзе каля вёскі Арэхаўка ў Стаўрапольскай губерні быў знойдзены запіс на выступе скалы: «Для Айчыны мілая смерць, шрамы і кайданы. Палякі ў годзе 1813», пад якім былі подпісы шэрагу асобаў, у тым ліку і падпаручніка з Мінскай губерні Міладоўскага...

У Астраханскай губерні згодна з падлікамі С. Н. Хомчанкі ў канцы 1812—сярэдзіне 1813 гадоў зафіксавана каля тысячы польскіх палонных. Самым вядомым з іх быў... прадстаўнік беларускага шляхецкага роду Тышкевічаў Тадэвуш (1774–1852)! У 1812-м ён быў генералам кавалерыйскай брыгады корпуса Ю. Панятоўскага. Т. Тышкевіч браў удзел у баях пад Мірам, Смаленскам, Барадзіно і трапіў у палон пад Мядынню (Калужская губерня). Адтуль генерал быў накіраваны ў Галоўны штаб, а пасля праз Калугу, Разань і Тамбоў канваяваны ў Астрахань. Пасля вяртання з астраханскага палону Т. Тышкевіч падаўся на кароткі час у Варшаву, а пасля перасяліўся ў Ваўкавыскі павет, дзе і жыў да паўстання 1830–1831 гадоў — калі стаў старшынёй часовага ўраду Літвы.

У другой палове 1814-га значнай колькасці вязняў вайны пашчасціла вярнуцца з Сібіры і Каўказа. Не сакрэт, што рэшткі ваенных фарміраванняў з адноўленага Напалеонам ВКЛ працягвалі ваяваць на баку Францыі да 1814 года. Пасля адрачэння Напалена былыя камбатанты атрымалі права вярнуцца ў Беларусь, прычым частка з іх нават атрымала былыя ўладанні.

У кантэксце вяртання на Беларусь яе сыноў-палонных, якіх у дакументах называюць «палякамі, прысланымі па пашпартах на ранейшае месца жыхарства з-за мяжы», вялікую каштоўнасць мае крыніца з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі — «Справа аб вяртанні ваеннапалонных на жыхарства ў Менскую губерню» (15.05.1814 — 27.12.1814 гг.) з канцылярыі Менскага губернатара П. М. Дабрынскага. Яшчэ ў красавіку 1814 года ў Менск былі дасланыя спісы тых, «хто вяртаецца на ранейшае месца жыхарства з ліку ваеннапалонных з войскаў Герцагства Варшаўскага, якія вызналі сябе ўраджэнцамі Менскай губ., а цяпер атрымалі білеты на вяртанне дадому». Тут мы сустракаем Івана Шчапанка з Ігуменскана павета, Рыгора Ткачэнку з Бабруйска, Карла Калантая з Барысаўскага павета, Андрэя Пракаповіча са Слуцкага павета, Стрэжа з Пінскага павета і інш.

Аб працэсе вяртання на радзіму з унутраных рускіх губерняў палонных палякаў і ліцвінаў-беларусаў сведчаць таксама пайменныя спісы партый, якія ў свой час накіроўваліся праз Беларусь у Польшчу. У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі захоўваецца «Пайменны спіс адпраўленай з Лябедзіна да Беластока пятай партыі ваеннапалонных палякаў, обер-афіцэраў і служак». Яе склад быў наступным: 14 капітанаў, 31 паручнік, 32 падпаручнікі, «адна афіцэрская жонка Караліна» і 5 служак; разам 83 асобы. У гэтым дакуменце пад №37 фігуруе паручнік Караль Вайніловіч. З наступных дакументаў высвятляецца, што ён не жадае насуперак папярэднім намерам ісці ў Герцагства Варшаўскае, а хоча застацца ў Беларусі. Для гэтага ён напісаў прашэнне на імя Менскага губернатара, вытрымку з якога варта працытаваць, каб растлумачыць прычыну паводзінаў К. Вайніловіча:

«Пакорнае прашэнне Палоннага польскай службы паручніка Караля Вайніловіча.

Служыў я ў польскім 22-ім пяхотным палку графа Чапскага... У 1812 г. быў узяты расейскімі войскамі пад Менскам у палон і быў накіраваны разам з іншымі ў горад Валчанск Харкаўскай губерні, дзе і знаходзіўся да апошняга часу. А цяпер накіраваны адтуль з іншымі палоннымі да горада Беластока. У ліку гэтай партыі я быў запісаны ўраджэнцам Герцагства Варшаўскага. Але паколькі я не Варшаўскі, а тутэйшы губерні ўраджэнец, дзе маю роднага тату і брата ды іншых сваякоў, таму і асмельваюся вашу Ягамосць святлейшую абцяжарваць, бо я сапраўды Слуцкага павету памешчык...

Верасня 3 дня 1814 года.

Karol Wajnilowicz Porucznik».

Гэтае прашэнне было разгледжана, і праз некаторы час згодна з рэзалюцыяй быў выпісаны адпаведны дазвол («білет») «вызваленаму ваеннапалоннаму польскай службы Каралю Вайніловічу». Пасля прыбыцця ў Слуцк ён павінен быў з'явіцца ў тамтэйшы ніжэйшы суд для рэгістрацыі...

Асобную катэгорыю ваеннапалонных беларусаў «польскай службы» складаюць тыя, хто пасля французскага адступлення імкнуўся перачакаць ва ўласных маёнтках небяспечны час. Аднак з вяртаннем расейскай адміністрацыі амаль усе яны былі ўзятыя на адпаведны ўлік. Да нашых дзён дайшлі статыстычныя матэрыялы. Так, напрыклад, на 22 верасня 1814 года толькі ў Ігуменскім павеце Менскай губерні налічвалася 22 такія асобы (!). Мы маем дакладныя біяграфічныя звесткі гэтых людзей, якія ў 1812-м былі ангажаваныя ў жандармерыю Аштопа, альбо ў Ігуменскую падпрэфектуру, ці служылі ў рэгулярных войсках Напалеона.

Паколькі палонныя палякі і беларусы з польскіх вайсковых злучэнняў падлягалі абавязковай высылцы на Каўказ, то яны, натуральна, імкнуліся схавацца ў мясцовых жыхароў, каб пазбегнуць далёкай прымусовай вандроўкі. Найбольш ахвотна ім давала прытулак шляхта.

Палонныя, якім пашчасціла вярнуцца на Беларусь у 1814–1815 гадах, так і не былі канчаткова рэабілітаваныя ў вачах мясцовай адміністрацыі. За імі ўводзіўся пільны кантроль, хоць былыя ваяры па «царскай літасці» і трапілі пад амністыю...

Антон Луцкевіч, Хведар Ільяшэвіч і Міхась Машара

Анатоль СІДАРЭВІЧ

У біяграфіі Антона Луцкевіча асаблівае месца займаюць яго кантакты і супрацоўніцтва з пісьменнікамі.



Мне ўжо даводзілася пісаць пра тое, якую ролю адыграў ён у творчым лёсе Уладзіміра Жылкі. Найлепш пра характар адносін паміж крытыкам-рэдактарам і паэтам сведчаць апублікаваныя ў свой час лісты Жылкі да Луцкевіча. Вельмі цеснае супрацоўніцтва склалася паміж Антонам Луцкевічам і Наталляй Арсенневай. Луцкевіч быў рэдактарам яе твораў, з дэбютнага верша пачынаючы, выдаўцом і рэдактарам яе першага зборніка і аўтарам першай рэцэнзіі на гэты зборнік. Паэтка перакладала па просьбе Луцкевіча рыфмаваныя вершы з «Кніг джунгляў» Рэдзьярда Кіплінга (прозу і нерыфмаваныя вершы перакладаў сам Луцкевіч).

Яшчэ адна творчая асоба, з якою лёс звёў Антона Луцкевіча, — Хведар Ільяшэвіч (1910–1948), карэнны віленчук, самабытны паэт, гісторык, літаратурны крытык, публіцыст, рэдактар.

У Энцыклапедыі гісторыі Беларусі, дзе змешчана найбольш поўная біяграма Хведара Ільяшэвіча, паведамляецца, што ў 1927 годзе ён, сямнаццацігадовы юнак, быў зняволены на Лукішках. Але знаёмства гэтага вучня Віленскай беларускай гімназіі з польскімі карнымі органамі пачалося яшчэ ў 6-м класе, і гэта занатавана А. Луцкевічам. Польскія паліцыянты на поўным сур'ёзе пыталіся ў падлетка, да якой партыі ён належыць. Да кампартыі, як яго гімназічны калега і таксама паэт Алесь Салагуб, гімназіст Ільяшэвіч не належаў. Мажліва, не быў і камсамольцам, хоць дырэктар гімназіі, камуніст Радаслаў Астроўскі шмат зрабіў для камунізацыі вучняў, многія з якіх потым стануць сталымі вязнямі польскіх турмаў або, уцёкшы ў Савецкі Саюз, пойдуць пад расстрэл.

Хто больш паўплываў на Хведара Ільяшэвіча — яго старэйшы брат гісторык Мікалай Ільяшэвіч ці яго гімназічны настаўнік Антон Луцкевіч, — сказаць цяжка, але з камуністамі ён не звязаўся. І адначасна застаўся чалавекам левых поглядаў. Пра гэта сведчыць яго супрацоўніцтва ў газеце «Наперад!», якая выходзіла ў Вільні з 12 снежня 1929 па 3 кастрычніка 1930 года.

Ужо тое, што газета мела назву «Наперад!», сведчыць пра яе сацыял-дэмакратычны характар. (Згадаем, што газеты пад тытулам «Наперад» — вядома, на мовах сваіх народаў — выдавалі Сацыял-дэмакратычная партыя Германіі, Італьянская сацыялістычныя партыя і некаторыя іншыя). Газета з левадэмакратычных і нацыянальных пазіцый востра крытыкавала тое, што дзеецца ў Савецкім Саюзе (калектывізацыя, пагром беларускай інтэлігенцыі). Ужо ў снежні 1929-га, яшчэ да таго, як афіцыйна быў абвешчаны курс на суцэльную калектывізацыю і пачаліся арышты ў «справе» выдуманага «Саюза вызвалення



У жыцці Антона Луцкевіча і Хведара Ільяшэвіча быў перыяд іх супрацы ў рэдакцыі газеты «Наперад!». Думаецца, з часам гэта будзе занатавана ў біяграфіях

Беларусі», А. Луцкевіч апублікаваў у трох нумарах запар вялікі аналітычны артыкул «З Радавае Беларусі». Змена палітычнага курсу і барацьба маскоўскага нацыяналізму з беларускім адраджэнскім рухам». У лютым 1930-га ў газеце быў надрукаваны вядомы памфлет А. Луцкевіча «Цень Азефа», у якім аўтар параўнаў Сталіна з вядомым правакатарам царскага часу. У артыкуле ж «Барацьба за моладзь» (8 студзеня 1930 г.) А. Луцкевіч паказваў, як Камуністычная партыя Заходняй Беларусі, атуманьваючы і камунізуючы вучнёўскую моладзь, вядзе шкодную для нацыянальных інтарэсаў палітыку. Ён звяртаўся да заходнебеларускай грамадскасці, да бацькоў: беражыце нашых дзяцей, не дайце, каб з іх рабілі «гарматнае мяса» нібыта ў імя «сусветнае рэвалюцыі».

З дакументаў, якія захоўваюцца ў аддзеле рукапісаў бібліятэкі імя Урублеўскіх у Вільні, можна даведацца, што газету чыталі, у прыватнасці, у Баранавіцкім, Бельскім, Браслаўскім, Ваўкавыскім, Дзісенскім, Навагрудскім паветах, у Заходняй Украіне, Латвіі, Чэхаславакіі... І, само сабой, у турмах. Напрыклад, захавалася паштоўка ў рэдакцыю Сяргея Сіняка (літаратара, дзеяча Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады, больш вядомага пад псеўданімам Сяргей Хмара), які пад той час сядзеў у Пінску. Другі ж адрасант, Дзмітрый Каленік, чытаў газету «Наперад» у знакамітай турме ў Каранове.

Пра тое, што Хв. Ільяшэвіч супрацоўнічаў у рэдакцыі газеты «Наперад!», сведчаць не толькі ягоныя публікацыі на старонках гэтага выдання, але і паштоўкі, якія захаваліся ў архіве колішняга Беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні. Пісаныя яны ў ліпені 1930-га. Антон Луцкевіч у той час (пэўна, разам з малалетнімі сынамі) адпачываў у Ракуцёўшчыне, а Хведар Ільяшэвіч заставаўся ў Вільні «на гаспадарцы» і інфармаваў свайго шэфа пра навіны. Адна паштоўка, пісаная лацінкай, адрасаваная на Ракуцёўшчыну, а другая, пісаная кірыліцай, — у Краснае-над-Ушою (мабыць, гэтак за польскім часам называлася тамтэйшае паштовае аддзяленне).

У паштоўцы ад 3 ліпеня 1930 года Хв. Ільяшэвіч паведамляў А. Луцкевічу: «З Прагі прыслалі Вам запрашэнне прыняць удзел у адкрыцці памятніка Крачэўскаму». У другой паштоўцы Хв. Ільяшэвіч інфармаваў А. Луцкевіча, што чарговы нумар газеты ўжо набіраюць, і ён мае выйсці 17-га ці то 18 ліпеня.

Паштоўкі цікавыя і тым, што ў іх утрымліваецца інфармацыя пра Міхася Машару, на той час аўтара паэтычнага зборніка «Малюнкі» (1928). Паэт, якога за актыўны ўдзел у працы Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады кінулі на 4 гады на Лукішкі, увесну 1930 года быў ужо на свабодзе. За час зняволення ён, трэба думаць, напісаў нямала вершаў, з якіх можна было скласці наступны зборнік. Аб выданні новай кніжкі М. Машара, пэўна, дамовіўся з А. Луцкевічам. Можна меркаваць, што, з'язджаючы ў вёску, А. Луцкевіч даручыў заняцца гэтаю кніжкаю Хв. Ільяшэвічу. З паштоўкі ад 3 ліпеня 1930 года мы даведваемся, што Ільяшэвіч «ужо дастаў (атрымаў. — А. С.) вершы Машары» і абяцаў узяцца «за укладанне зборнічка». У другой паштоўцы Хв. Ільшэвіч пісаў А. Луцкевічу, што ён «ужо ўзяўся за ўкладанне зборніка вершаў Машары». І дадаваў: «...зборнічак будзе шыкоўны!».

Мы ведаем, што другі зборнік вершаў М. Машары — «На сонечны бераг» — выйшаў у 1934 годзе. Чаму не ўбачыла свет ягоная кніжка, якую меліся выпусціць у 1930-м, спадзяюся, з часам высветліцца. Я ж хацеў паказаць, што ў жыцці Антона Луцкевіча і Хведара Ільяшэвіча быў перыяд іх супрацы ў рэдакцыі газеты «Наперад!». Думаецца, з часам гэта будзе занатавана ў біяграфіях як паэта, так і яго гімназічнага настаўніка.

Пра першыя апублікаваныя вершы Сяргея Хмары і Пятра Дабрыяна

Сяргей ЁРШ

Даследчыкі творчасці паэта Сяргея Хмары (1905 — 1992, сапр. Сяргей Сіняк) чамусьці не звярталі ўвагі на той факт, што яго першы верш быў надрукаваны ў віленскай беларускай газеце «Крыніца» пад псеўданімам іншага паэта з Дзятлаўшчыны — Н. Жальбы (Аляксандра Бяленкі, 1898–1991). Здарылася гэтая прыкрая памылка па віне рэдакцыі (рэдактарам і выдаўцом газеты ў той час быў Браніслаў Туронак).

Час

Годзі! Мы доўга цярпелі
Мы доўга хадзілі ў ярме,
Крывёю зямлю палівалі
Сотнямі гнілі ў турме.
Час нам здабыць сабе долю,
Поўнымі дыхнуць грудзьмі,
Па веку нявολі і здзеку
Зноў зажыці людзьмі.
Хоць сонца схавалась за хмары,
Ня згінуў крывіцкі ўйчэ род,
Жыве яшчэ нашая мова
Жыве яшчэ наш і народ!
Час прад благімі панамі
Нам галавы ня хіліць, —
Даволі ўжо сварак між намі
Годзі край родны губіць!
Час ужо нам, брацьця, ядначаца
Для шчасьця сваей стараны —
І паказаць усяму сьвету,
Што мы свайго краю сыны.

Čas // Krynica, 1925, 12 красавіка, № 14-15. У арыгінале — на беларускай лацінцы.

19 ліпеня 1925 года ў рубрыцы «Наша пошта» рэдакцыя пісала Хмару: «Чаму Ваш верш падпісалі псэўдонімам Н. Жальба, дык і самі ня ведаем. Даруйце!».

Безумоўна, Сяргею Сіняку было крыўдна. Праз 13 гадоў ён прыгадаў тую непрыемную сітуацыю: «Першы раз у друку ў 1925 г. Рэдакцыя «Крыніцы» папутала мяне з Жальбай і мой першы верш быў надрукаваны пад ягоным псэўданімам». (Шлях моладзі, 1938, 7 кастрычніка, № 21).

Дзіўна, але і вясной 1926-га ўжо «Беларуская крыніца» зноў назвала аўтарам верша «Час»... Н. Жальбу. Нехта «Стары Дзед» хваліў гэты твор ды адзначаў, што з яго атрымаецца добрая песня. (Hutarki Staroha Dzieda // Biełaruskaja krynica, 1926, 31 сакавіка, № 11).

***

Іншая гісторыя з паблытаным псеўданімам звязана з паэтам са Слонімшчыны Пятром Дабрыянам (1916–1993). Ва ўсіх (!) публікацыях пра яго творчасць (напрыклад, таго ж паважанага даследчыка Уладзіміра Калесніка), у «Слоўніку беларускіх псеўданімаў» Янкі Саламевіча згадваецца яго псеўданім «Алесь Сучок». Нібыта, пад ім ён здзейсніў публікацыю свайго першага верша на старонках віленскага беларускага часопіса «Шлях моладзі». Але калі паглядзець той нумар выдання, то бачым, што верш «Я бачыў» падпісаны «Андрэй Сучок» (Шлях моладзі, 1938, 25 лістапада, № 24. С. 3). І гэта не памылка, бо і ў «Паштовай скрынцы» рэдакцыя пісала менавіта «Андрэю Сучку»: «Здольнасьці маеце, толькі старайцеся іх лепш разьвіваць, чытаючы бел[арускіх] клясыкаў... З апошніх вершаў паправіўшы адзін друкуем».

Андрэем Сучком быў падпісаны і верш «Зіма», апублікаваны ў «Шляху моладзі» 12 студзеня 1939-га. Наступныя творы П. Дабрыян падпісаў «А. Сучок». Толькі ў паваенны час ён стаў вядомы як паэт «Алесь Сучок». Чамусьці Дабрыян ніколі не расказваў пра свой першы псеўданім.

Пераплываючы Дунай, пераплываеш самога сябе

(пра кнігу ўкраінскага паэта Уладзіміра Калікі)

«Каля сіняга Дунаю стану, гляну, падумаю…» — менавіта гэтыя радкі з беларускай народнай песні прыйшлі ў галаву разам з апошняй старонкай зборніка. І справа не ва ўзгадванні самога Дунаю ў кнізе, а ў тым сэнсавым напаўненні, якім надзяліў гэты вобраз паэт.

Зразумела, ні для каго не будзе адкрыццём, што Дунай ва ўсіх славянскіх народаў з'яўляецца не проста ракой, а сапраўдным сімвалам. І, думаецца, залішне тут расцякацца «мыслию по древу» пра тое, як «сели суть Словене по Дунаеве», і пра адлюстраванне гэтай падзеі ва ўсходнеславянскай вуснай народнай творчасці. Аднак тое, што сёння, у час перагледжання каштоўнасных арыенціраў, калі агіднае ўзводзіцца ў ранг прыгожага, а высокае саступае месца нізкаму, магчыма, як ніколі важна зірнуць на чалавецтва праз прызму светлых дунайскіх вод. І як доказ гэтаму — кніга львоўскага паэта Володымира Калікі «Пераплыву Дунай».

Дунай і ва ўкраінцаў, і ў беларусаў сімвалізуе мяжу. Мяжу паміж дабром і злом, паміж святлом і цемрай. Такую ж функцыю выконвае гэтая велічная рака і ў аўтарскай канцэпцыі зборніка. «Там, за Дунаем», можна пабачыць і Залатую Зямлю, да якой варта імкнуцца; і летуценную дзяржаву Эладу, якую ніяк не ўдаецца пабудаваць у рэчаіснасці; і «геніяльную» цішу простага заходнеўкраінскага сяла; і Сакрата, які «па рэпу йдзе на градку», і Сафокла, што «ад дыялогаў змяк»; і паэта, які стаў шпалай, «каб адпраўляліся у шчасце цягнікі», і многае іншае, чаго няма на гэтым беразе, але што так моцна вабіць сваім хараством і незвычайнасцю…

А на другім беразе ракі чакае нас «фальклорны казак Мамай», які не ведае «фальшы і зыску» і дабрадзейства якога спарадзіла вялікую колькасць легенд і паданняў, зрабіла яго сімвалам заступніцтва роднай зямлі і народу і прывяло да таго, што нават карціны XV ст. з яго выявамі сталіся па пэўным каноне. Аднак казак Мамай не проста каменны помнік — ён актыўна далучаецца да цывілізацыі: вядзе дзённік, удзельнічае ў віртуальных выступах, карыстаецца мабільнікам, дасылаючы нам эсэмэскі з мінулага…

Володымир Каліка стварае шырокае палотнішча вобразаў, якія цешаць душу сваёй цеплынёй і прыгажосцю, мімаволі нясуць тваю існасць у свет чысцютких, як дунайскія воды, аўтарскіх памкненняў… Паэт не спрабуе напалохаць альбо застрашыць, а імкнецца захапіць шчырасцю і пранікнёнасцю акаляючага нас свету, якія так часта застаюцца незаўважанымі ў гэткі хуткаплынны і матэрыяльна-арыентаваны час.

І, вядома, у гэтым не малую ролю адыгрывае вобразная сістэма яго твораў, пачынаючы ад сакавітай мовы вершаў, у якой так шмат і заходнеўкраінскіх дыялектызмаў, і прастамоўяў, і ўласных аўтарскіх наватвораў, і заканчваючы багатымі вобразна-выяўленчымі сродкамі, якімі стракаціць ледзь не кожны верш. На паэтычных прасторах мыслення Володымира Калікі «ўяўны Гогаль прутком зграбае ў печы жар», «над туманам, быццам лодзіі, галовы конскія плывуць», «духмяніцца ціша салодка, што аж пчолы раямі ляцяць», «на вакзале восень гандлюе балканскімі слівамі», «на маміным гародзе спяваюць агуркі», «кот з калгаснага туману ў хмызах прадзе фальклору ніць», «лес мяняе мову жніўня на вераснёвы дыялект», «чытае дождж жывую песню лугу зялёнымі вачыма казлянят»... Усё гэта стварае ўражанне гармоніі і спакою, сярод якога толькі лірычны герой не пазбаўлены дынамізму, і то «бліскаўку падлоўленую ўвішна заганяе ў хлеў даўгім дубцом», то размаўляе «ў Парыжы з Пікаса, які ўзнёсся, як вежа, над часам», то вырашае, ці яму «навязаць рукавічак», ці лепш «вестыбюль падмятаць», то імчыць за сваімі ўспамінамі «наўздагонікі»…

Канешне, цяжка верыцца ў існаванне такой ідыліі. А таму, відаць, аўтар не стварае вершы — ён складае міфы. Менавіта міфамі называе Каліка свае творы. І ў гэтым, зразумела, ёсць свой глыбінны сэнс, які адкрываецца толькі разам з апошняй старонкай кнігі. Спасцігнуць сутнасць гэтых міфаў можа толькі падрыхтаваны чытач, той, «хто чытаць навучыўся Сакрата».

«Міфалогія» Калікі не імкнецца тлумачыць нейкія незразумелыя факты і з'явы — яна ўздымае шэраг праблемных пытанняў, якія рана ці позна давядзецца вырашаць. А таму чырвонай ніткай праз усю кнігу праходзіць тэма будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы, яднання народа і яго долі ў будучыні. З непрыхаваным болем адзначае паэт:

Калі б на трон народны
не вяльможны
не пралязала Злосць,
Зазнайства, Здрада, —
то ў нас даўно, даўно, даўно,
даўно ўжо
была б шчаслівай і свая Элада.

Для гэтага ёсць рэальныя магчымасці, аднак на дадзеным этапе паэт у стане карыстацца толькі формамі ўмоўнага ладу: «калі б…». Відавочна, што гэтая праблема надзвычай актуальная не толькі для ўкраінцаў, але і для іх паўночных суседзяў.

Калі б жылі мы гэтак, як павінны,
і даўніну збіралі безупынна…

Калі б жылі без рудыменту
гнеўнага
і сэрцам прыхіліліся да крэўнага…

Толькі на глебе нацыянальнага магчыма пабудаваць «непаўторную Эладу», каб жылося ў ёй добра «грамадзянам эладзянкам і эладзянам». Цяпер жа паэт бачыць толькі цені «садамісцкіх сядзіб», парэшткі «пакроенага краю» і ганьбу «асаромленага люду».

Аднак у «Міфе пра няскораную нацыю» Каліка на ўвесь голас абвяшчае: «Дунайцы мы, а не данайцы». Зразумела, што пад назвай «дунайцы» перш за ўсё маюцца на ўвазе ўкраінцы, «да вечнае волі пакліканыя», нягледзячы на тое, што доўгі час былі «страляныя і шабляваныя, у рэзервацыях ізаляваныя, у жорнах быцця петляваныя…»

Якраз на другім беразе Дунаю і жыве дунайскі народ. Няскораны і велічны, мудры і праўдзівы, ён з'яўляецца сімвалам той неўміручасці і жыццястойкасці, да якіх трэба імкнуцца яго нашчадкам. Для гэтага дунайцы пакінулі ў спадчыну сваім паслядоўнікам багаты фальклор, каб яны заўсёды «думалі пра Дунай». Адсюль, бясспрэчна, так шмат увагі Каліка надае вуснай народнай творчасці і яе ролі ў жыцці сучаснага чалавека. Так, у многім ён карыстаецца фальклорнай паэтыкай, часта з пад яго пяра выходзяць нават вершы-стылізацыі пад фальклорныя творы, але ў перапрацаваным, так бы мовіць, «асучасненым» выглядзе. І ў гэтым таксама выяўляецца аўтарскі падыход да разумення сённяшніх праблем. «Зусім не варта сумнявацца ў класіцы: яна заўжды сучасная, як Дунай» — упэўнівае паэт. Чаму ж у такім выпадку нельга зірнуць на фальклор як на класічную спадчыну народа, які зберог у ім уяўленні пра свае найлепшыя якасці і памкненні?.

Менавіта фальклор і Дунай з'яўляюцца асноўнай рухаючай сілай натхнення паэта. І Дунай часам можна асацыяваць не толькі з канкрэтнай ракой, але і з вялікай воднай прасторай. Вада як жыццядайная і жыццесваральная сіла з'яўляецца яшчэ і першакрыніцай, першавытокам чалавечае мудрасці. «…я нібыта жарабятка, што ўсё з Дунаю п'е фальклор» — прызнаецца лірычны герой аднаго з міфаў. А таму і фальклор — гэта якраз тая кропля ратавальнай вады, што спатоліць смагу ў самыя засушлівыя часы. Гэта не проста этнакультурная з'ява, а якраз тая мудрасць і тыя веды, якія шліфаваліся і выпрабоўваліся не толькі часам, але і жыццёвым досведам пакаленняў. Адмахнуцца ад набыткаў папярэднікаў — згубна і недаравальна. А таму і эсэмэскі казака Мамая наступнікам сведчаць пра тое, што месца фальклору ў жыцці сучаснікаў усё ж такі ёсць, і яно далёка не апошняе, бо менавіта там, за пыльнымі кіламетрамі пройдзеных і забытых шляхоў, нашчадкі павінны адшукаць тую гаючую крыніцу мудрасці, якая, разліўшыся вечным Дунаем, і дапаможа пераплысці праз усе выпрабаванні сённяшняга свету.

Максім Баравік

Святло паэзіі Юрыя Баены

У бібліятэцы беларускага літаратурнага аб'яднання «Белавежа» выйшаў паэтычны зборнік «Шкатулка святла» Юрыя Баены.



Паэт спадзяецца толькі на хлеб, бо хлеб — святая тайна чалавечнасці. І кланяецца ён менавіта хлебу, паважае яго, пяе яму гімны. А дзе хлеб — там і слова

Аўтар жыве на Беласточчыне. Скончыў геаграфічны факультэт Люблінскага ўніверсітэта імя М. Кюры-Складоўскай. Працуе настаўнікам геаграфіі…

З чуллівай своеасаблівай самотай чытаюцца вершы Юрыя Баены, прысвечаныя маленькай радзіме — вёсцы Мокрае Бельскай гміны, дзе нарадзіўся паэт. У іх адчуваецца туга па маленству, для якога родны кут — дзяржава, «вытканая з зямных і нябесных нітак». Заўсёды моляцца дарогі і сцежкі, сады, лугі, палі, каласы, рамонкі, бярозы, дубы, ясені, жаваранкі і буслы, вятры і росы, снягі і сонца, каб мы часцей вярталіся дадому:

Вярнуўся я
як сын, як брат,
у абдымкі роднага
і харства!

Вёска Мокрае для Юрыя Баены не толькі ягоная дзяржава, але і светлы далягляд, бастыён. Мне здаецца, ніхто болей за Юрыя Баену і Віктара Шведа не апеў сваіх маленькіх радзімаў на Беласточчыне так, як апелі яны Мокрае і Мора. Так і просіцца сказаць: Мокрае Мора, апетае паэтамі.

У кожным сваім паэтычным зборніку Юрый Баена не абыходзіць тэму жыта і хлеба. Калі я пачынаю чытаць падобнае, мне заўсёды прыгадваюцца радкі Аляксея Пысіна: «Забыта многае ў жыцці, з дарогі змецена і змыта. Мне ў жыта хочацца ўвайсці, мне вечнасцю здаецца жыта». Пысінскай вечнасцю заўсёды напоўнены вершы пра хлеб аўтара кнігі «Шкатулка святла». Паняцці хлеб, жыта, колас і ўсе вытворныя ад іх асацыяцыі і матывы — буйныя планы баенаўскай лірыкі, яе падаснова, яе чырвоны радок.

Паэт спадзяецца толькі на хлеб, бо хлеб — святая тайна чалавечнасці. І кланяецца ён менавіта хлебу, паважае яго, пяе яму гімны. А дзе хлеб — там і слова. Будзе хлеб — будзе і слова. Слова, як піша аўтар, гэта «святло ў вялікім, чорным, быццам смала, пакоі ночы», «слова святое, нескаронае, вернае». Каму моліцца паэт? Паэт моліцца слову: «ля грані, нябыту і жыцця, цемры і святла малюся Табе, Магутнае Слова».

Так нараджаецца паэзія перажывання, роздуму, надзеі, вобразаў. Навізна паэзіі Юркі Баены — у глыбока творчай здольнасці аўтара шукаць і знаходзіць на старыя пытанні новыя адказы, насычаць іх новымі шматзначнымі ўяўленнямі пра свет, уласнымі назіраннямі, вопытам дарог, грамадзянскай мужнасцю пазнання набалелых праблемаў і шчаслівых радасцяў.

У новым зборніку паэта ёсць унікальны верш, які мае назву "За шчасцем" (па-беларуску правільна будзе «па шчасце»). Сюжэт яго такі: паэт бачыць, як грамада людзей стаіць у чарзе па шчасце, а ў той грамадзе тысячы людзей, і ўсе хочуць дацягнуцца да шчасця. Тры дні яны стаялі і тры ночы. Сярод іх быў і аўтар, бо таксама захацеў шчасця. Ён так і піша: «я таксама там быў, горыч з келіха піў…». Вось і ўсё шчасце.

Свой новы зборнік Юрый Баена назваў «Шкатулка святла». Шкатулка — гэта невялікая скрыначка для дробных, звычайна каштоўных рэчаў. Дык што, акрамя вышэй пералічанага, схаваў у ёй аўтар? А схаваў ён — пацалункі жыцця. І працягвае пісаць «лісты без дат — вершы на ўсю вечнасць», бо верыць, што ён, як паэт, на сваёй зямлі пакіне след. Яго пацалункі жыцця няпростыя, розныя: канкрэтныя, сімвалічныя, метафарычныя. У вершах заўважаецца імкненне да гульні на кантрастах, на нечаканых паваротах думкі, на нюансах слова, якія асвятляюць як маланкі, становячыся і тваім празрэннем, і твам адкрыццём.

Вершы Юрыя Баены са зборніка «Шкатулка святла» хочацца чытаць і перачытваць. Вядома, не ўсе яны аднолькавыя. Ёсць у некаторых і свае слабасці. Але казаць пра іх — ці ж мае гэта сэнс? Чытаючы паэта, верыцца, што прага жыцця, адчуванне харства Радзімы, прыроды, чалавечай працы, роднай мовы, слова, песні, — што ўсё гэта яшчэ паўторыцца ў яго новых вершах і зборніках. Верыцца, што святло паэзіі Юрыя Баены будзе яшчэ доўга асвятляць нашыя душы і сэрцы.

Сяргей Чыгрын

Як палёт над безданню

Хтосьці сказаў, што ісціна топіцца ў шматслоўі. Леанід Маракоў не піша доўгіх твораў. Як празаік ён найперш вядомы кароткімі вострасюжэтнымі апавяданнямі.



Зборнік «Непамяркоўныя» складаецца з дзвюх частак: 19 апавяданняў, не звязаных між сабою, у другой — 8 апавяданняў, у якіх высвечваецца лёс хлапчука, блізкага да самога аўтара.

Пачынаецца кніга апавяданнем з рускай назваю «Помни случай с Ивановым». Аказваецца, Іваноў па крыві быў беларусам, вырас на гэтай зямлі, але рэвалюцыі не прыняў, бо яна, як меркаваў яго бацька, несла толькі разбурэнне. Цераз Крым іх сям'я пакідае Расею і апынаецца на чужыне, у Францыі. Воляю лёсу ці абставінаў Міця Іваноў канчае школу разведчыкаў, і яго закідваюць у Савецкі Саюз, каб тут укараніцца і стаць шпіёнам — з перспектывай на доўгую службу-работу. Зноў жа — воляю абставін — Іваноў заступаецца за хлапчука, знішчае трох «шакалаў» і становіцца ахвярай — яго асуджаюць на расстрэл. Адсюль і пачынаецца яго — вымушаны! — подзвіг: ён адзін знішчае ўвесь канвой з адзінаццаці чалавек! Застаецца толькі адзін чалавек, якога ён не забівае, а адпускае ў лагер: гэта аказаўся свой чалавек, беларус. Канчаецца апавяданне так: «І праз дваццаць, і праз трыццаць гадоў кожнага ахоўніка-новабранца, які прыбываў у Амурдальлаг, вялі на мясцовыя могілкі да слупка, надпіс на якім рэгулярна аднаўляўся, каб папярэдзіць: «ПОМНИ СЛУЧАЙ С ИВАНОВЫМ»».

І далей — якую ні вазьмі навэлу: «Госці», «Бацька і сын», «Арэлі», «Дзень ікс», «Трэцяя спроба» — усё балюча, усё цікава, усё бярэ за жывое. Апавяданні на розныя тэмы, але ўсе, як правіла, пра трагічна-драматычныя здарэнні ў лёсе герояў: «Апошнія вакацыі Валера Маракова» — як яго арыштоўваюць на вакзале ў Менску і як ён шкадуе, што не ўзяў з сабою свайго маўзера, каб не здацца ў рукі «слугаў народа».

Найбольш уражвае апавяданне «Настальгія». Гэта пранізлівы крык душы, збалелай па пакінутай Радзіме, у якую герой можа вярнуцца толькі ўпотайкі, бо ён тут лічыцца чужаком, тут яго чакаюць не з хлебам-соллю, а адкрытымі варотамі ў турэмнае пекла. Наш герой прыехаў на радзіму карэспандэнтам французскай газеты «Юманітэ-Дзіманш», на сустрэчу з моладдзю, на фестываль. Адпаведна і прозвішча ў яго французскае — Філіп Трэйзон. Яму важна было скарыстаць гэты час для таго, каб пабыць дома, пабачыць маці, падыхаць родным паветрам. З вялікімі прыгодамі яму ўдасца вырвацца з чэпкіх абдымкаў каманды, якой было загадана апекавацца замежным госцем. Ён прыязджае ў Беларусь, дзе яго чакае маці. І вось прычакалася! Але радасць не дарэмная: сына чакаюць салдаты з чырвонымі пагонамі. Паранены Міхась памірае на руках у маці...

Другая частка кніжкі — цыкл апавяданняў, у якіх фігуруе адзін галоўны герой — Санька. Падобная проза разлічана на юнага чытача (яна пра ўзнёслыя, маладыя і гарачыя пачуцці). Амаль усе апавяданні гэтага цыкла драматычныя ці трагічныя. Першае — «Валюша». Малога сынка жанчына водзіць у садок, а сама працуе на фабрыцы. Жывуць яны ў сутарэнні, там холадна і сыра. А пяць гадоў таму чужыя — так называе іх Валюша — прыйшлі, зрабілі вобыск і забралі мужа. На спатканне ў турме яе не пускалі... Аднойчы, вяртаючыся дадому, яна ўбачыла каля сваіх весніц чалавека: гэта быў яе муж, але ў непрытомным стане. Такім яго і забралі ў бальніцу. След чалавека згубіўся...

Заканчваецца цыкл трагічна: Санька пазнае ў адным з бамжоў свайго былога настаўніка, хоча яму дапамагчы, але той ужо звыкся са сваім няшчасным лёсам. Барацьба за «тэрыторыю» прывяла да трагічнай развязкі: такі ж бомж, толькі з крымінальнай біяграфіяй, забівае свайго канкурэнта, каб завалодаць кварталам і гаспадарыць аднаму. «Мы ва ўсім вінаватыя, мы! — дакараў сябе Санька. — Заслужаны настаўнік — бомж, і ўсе маўчаць! Мая хата з краю. Трэба нешта мяняць, развязваць гэты Гордзіеў вузел».

Узнятыя ў апавяданнях тэмы — вельмі надзённыя, балючыя для грамадства. Шмат таго, што павінна было б адысці ў нябыт, засталося і атручвае нам жыццё, выклікае пратэст. І менавіта большасць герояў зборніка — гэта непамяркоўныя, якія не мірацца са сваімі нягодамі, а вядуць з імі адкрытую барацьбу.

Памяркоўнасць — гэта якраз тое, з чым змагаюцца героі большасці апавяданняў зборніка. Узвелічэнне гэтай барацьбы было галоўнай задачай аўтара, з якой ён выдатна справіўся.

Уладзімір Дамашэвіч

Кніга сораму і адказнасці:

Падручнік для беларускага журналіста

Кацярына Оаро, «Сарочае радыё» / серыя «Пункт адліку» Бібліятэкі Саюза беларускіх пісьменнікаў. — Мінск, «Кнігазбор», 2013.

Сваім часам Дэйл Карнэгі напісаў кнігу «Як перастаць непакоіцца і пачаць жыць». Мы не Карнэгі — мы ведаем, што чалавек застаецца чалавекам, пакуль ён турбуецца, клапоціцца і непакоіцца. Прынамсі, у Беларусі гэта працуе менавіта так.

Калі б мяне папрасілі ахарактарызаваць кнігу Кацярыны Оаро «Сарочае радыё» ў двух словах, я б сказаў, што гэта кніга сораму і няёмкасці. Менавіта гэтыя два словы найлепш характарызуюць галоўную гераіню: сорам і няёмкасць — уласцівасці сумленнага чалавека. Сорам — ад таго, што не можаш дапамагчы перамозе добрай справы. Няёмкасць — ад таго, што вымушаны працаваць у падполлі, пад псеўданімам і хаваць гэта ад большасці навакольных.

Сумленным журналістам быць няпроста паўсюль, нават у Штатах (ведаем — дзякуй Галівуду!). У Беларусі быць сумленным журналістам складаней удвая — у гэтым пераконваецца гераіня аповесці «Сарочае радыё» Таня Цыбулька.

Увогуле, гэты твор можна было б рэкамендаваць для чытання абітурыентам журфаку — каб азнаёміліся з вялізнай колькасцю будучых праблемаў. Вы хочаце пісаць на тэмы культуры, як і большасць журналістаў-пачаткоўцаў? Не чакайце такой літасці ад рэдактара Улада — яе не будзе. Увесь асартымент, які вас чакае, — гэта пераважна сацыяльныя праблемы: барацьба ўладаў са спадарожнікавымі талеркамі, радыяцыйная плітка на галоўнай плошчы сталіцы... Бываюць і сустрэчы з цікавымі, неардынарнымі людзьмі, але зноў жа зусім не ў рамках культуры, напрыклад, з хворай на рак Ірынай Казулінай.

З культурай журналістка перасякаецца толькі на судовай лаве — на працэсе, на якім артыст Павел Харланчук адстойвае сваё права на акторскую прафесію. Ды яшчэ ў студэнцкай аўдыторыі, дзе выкладчык-перастрахоўшчык заніжае адзнаку за студэнцкую працу толькі таму, што яна прысвячаецца творам Васіля Быкава — пісьменніка, непрыемнага для ўлады.

Аповесць насычаная і, можа, нават перанасычаная беларускімі актуаліямі — падзеямі і персанажамі. Зрэшты, мастацкасці твору гэта не шкодзіць: усе рэальныя асобы і падзеі паказаныя вачыма журналісткі Тані Цыбулькі. Паказаныя так,



як рэпартажная журналістыка не малюе сваіх персанажаў.

Аповесць «Сарочае радыё» магла б стаць добрай асновай для вострасюжэтнага (сацыяльнага!) кінабаевіка. Пры ўсім тым, што аўтарку больш цікавіць унутраны свет галоўнай гераіні, а не вонкавыя падзеі. Інакш перад намі ляжаў бы зборнік артыкулаў пра надзённае, а не мастацкая кніга.

Падабенства да «трылера» — гэта не плюс і не мінус аўтара. Проста ў іншай стылістыцы апісваць журналісцкую працу ў цяперашняй беларускай рэчаіснасці складана.


Зміцер Дзядзенка

Беларуская літаратура першая ў свеце дасягнула дасканаласці

The Other Side of Literature

Анка УПАЛА

Тэкст можна разломваць на кавалкі, як хлеб. Фраза па-за тэкстам толькі акругляецца, поўніцца зместам. А калі разламаць яе на асобныя словы, наагул выяўляецца бездань.



Мне падаецца важным усвядоміць, што літаратура можа быць не толькі складзена са слоў, але і раскладзена з іх.

У адным з маіх ненапісаных тэкстаў персанаж Каталагізатар разбірае ўсе кнігі, што трапляюць яму ў рукі, на асобныя словы і захоўвае іх у аблокавых сховішчах. Так ён мае аблокі са словамі «Я»,«прыйшла» , воблака са словам «Ты»... Гэта аўтар, які дае літаратуры спраўдзіцца ў поўным аб'ёме.

На сённяшні дзень тэкстаў складзена так шмат, што раскладаць іх можна практычна бясконца. Як масавая з'ява — яно непатрэбна. Але ўсведамляць гэты бок літаратуры карысна гэтак жа, як у мастацтве разумець, што візуальнае можа быць сабрана і, як навалка, вывернута праз чорны квадрат. Разумець, што тэкст можа быць раскладзены на словы і такім чынам створаны наноў — значыць нарэшце ўбачыць літаратуру як з'яву цэлай, а не палавінчатай.

У раскладанні добра тое, што нават блага напісаны тэкст пры гэтым набывае глыбіню, калі не на ўзроўні фразы, то ўжо гарантавана на ўзроўні слова. Бо слова сапсаваць немагчыма. Аднолькава паспяхова можна раскласці папсовую песеньку і класічны раман. Розніца толькі ў тым, на колькіх узроўнях мы будзем адчуваць сэнсоўнасць.

Ёсць аўтары, якім не дадзена складаць, і ўсё ж яны імкнуцца займацца літаратурай. Я б параіла ім займацца раскладаннем сваіх і чужых тэкстаў. Адзінае, што нельга замацаваць за сабой аўтарства на слова, калі ты не сам яго прыдумаў. Раскладанне тэкстаў — вельмі бескарыслівы і пры гэтым глыбокі спосаб займацца літаратурнай творчасцю.

Я прапаную раскласці беларускую літаратуру, класічную і сучасную. Кожны можа рабіць гэта для сябе, узяць любы тэкст любога беларускага аўтара, дзяліць яго на фразы, калі дазваляе майстравітасць стваральніка пачатковага тэксту, і словы — ды раскрываць сэнсы, якія на ўзроўні слова максімальна поўныя і дасканалыя. Зрэшты, маёй прапановы ўжо дастаткова, каб лічыць беларускую літаратуру раскладзенай на словы, бо тут дастаткова ідэі. Такім чынам, беларуская літаратура — першая ў свеце, якая была раскладзена і дасягнула дасканаласці.

«ДЗЕЯСЛОЎ» №68

«Пачысціць зубы ірландскім паветрам»

ЛеГАЛ

Нейкая дзіўная надалася вясна. І снег даўно сышоў, а сапраўднага цяпла ўсё няма. Ні знаку таго прачынання, ні праяў абуджэння... Прырода нібыта не можа выйсці з летаргічнага сну... І ўвесь гэты час не пакідала маю душу нейкая неўразумелая затоеная трывожнасць...

Вось — як снег на галаву — смерць нацыянальнага Паэта... Што і казаць, і сам *дар* таленту, і паэтычнае *здарэнне*, і *дараванне* багемнага граху — усё з аднаго кораня, з адной боскай скарбніцы. Таму Рыгор Барадулін адышоў гэтак жа *нечакана-дзіўна*, як і ўсё, што звязана з паэзіяй.

А час зусім не лірычны. Голас флейты заглушаецца гарланным горнам. Моўкнасць паэтаў заглушаецца гнеўным галасам бяздушных прагматыкаў і дыктатараў. Расея на парозе вайны з Украінай. І для нас *«іхняе ўсё»* панікла перад годнасцю **Кабзара...**

Памолімся ж за Украіну...

Але не забывайма і пра сваё. У тым ліку і пра нашу літаратуру. Пацыху-памалу і яна піша драматычную гісторыю беларускага чалавека...

Выйшаў з друку 68 нумар часопіса «Дзеяслоў». Агледзім яго сутнасны змест па-парадку. Адкрывае публікацыі гарадзенка **Данута Бічэль**, якая цяпер знаходзіцца на новым паэтычным уздыме. Пасля чарады гадоў яе пераважна рэлігійных вершаў-літаняў наступіла пара *наіўнай* чалавечай мудрасці і слоўна-духоўнага ўзнясення...

Неба населена духамі, душамі
ды анёламі,
святымі, маўклівымі і вясёлымі...
Кажуць, дарога ляжыць
праз сэрца,
пакуль яно б'ецца, ці так яму
толькі здаецца...

Гэтыя вершы не напісаныя, а прагавораныя (выдыхнутыя), як праявы духу, што азіраецца, развітваючыся з усім сваім зямным — помным і прамінулым... У пэўным сэнсе гэта і патаемныя малітвы душы, падслуханыя і вычутыя сэрцам паэткі. Нешта падобнае адбываецца, калі сцюдзёнай зімой дзіця, пакінутае само на сябе, зачараванае адхуквае ў хаце замерзлую шыбіну, каб убачыць за ёе фантастычна-казачным, халодным роспісам жывы прыцягальны свет вечнага жыцця...

Чытэльная кароткая проза **Уладзіміра Някляева** — гэта лагічна выверaныя сюжэты з алагічна-фантасмагарычнымі сцэнамі, якія люструюць мінулыя і сучасныя праявы нашага грамадскага жыцця...

А вось вершы **Зміцера Вішнёва** (адзін радок з якіх я запазычыў для назову гэтага агляду, — **ЛеГАЛ**) пакідаюць чытача ў тонусе, праўда, і не больш за тое. Яны — па-за класічна-традыцыйнай сістэмай каардынат звычнай беларускай паэзіі. Зміцер выварочвае сэнсы чалавечага жыцця, і яны ў яго

блішчаць сокам і шклом схаваных палотнаў
кропаюць алеем мастацкіх
думак...

Алесь Усеня працягвае публікацыю рамана «Грэх». У гэтым нумары чытачам прапануецца другая кніга аб'ёмнага твора. Як мне падалося, гэта якраз найбольш захапляльная яго частка. Апісваецца Рым часоў імператара Адрыяна, прыкладна ў гады Парфянскай вайны: узаемаадносіны ў імперскай дзяржаве высокапастаўленых асоб і прасталюдзінаў, патаемная барацьба за трон і ўладу, рытуалы рымскіх цэзараў, баляванні, ежа, адзенне, паводзіны і традыцыі.

Але галоўнае ў творы — класічны трохкутнік: малады іудзейскі раб Архелай і рымскі сенатар Гней, некалі легіянер-заваёўнік, які аказваецца бацькам Архелая (аказваецца, некалі легіянер згвалціў яго маці пры чарговым заваёўніцкім паходзе на Іудзею), абодва закаханыя ў хрысціянку Вірсавію, на якую да таго ж паклаў вока і хоча выкупіць у Гнея заможны забудоўшчык Акіла... Дык вось, мяне як чытача менавіта гэтая сюжэтная лінія трымала ў напружанні даастатку. Захапляльнае чытво. Дадам яшчэ, што пэўныя трактоўкі падзей, учынкаў і характараў асобных герояў, тым ці іншым чынам, відочна накладваюцца на сучасныя праявы нашага грамадска-палітычнага жыцця.

Што да тэкстаў беластокца **Яўгена Вапы,** то, на маю думку, усё гэта ён мог бы напісаць мастацкай прозай, але раз не змог, значыць, была вельмі важкая прычына выказацца менавіта вершамі...

Досведна-павучальныя аповеды-згадкі друкуе **Зянон Пазняк.** Пішучы ў асноўным пра савецкі час жыцця, ён не прамінуў выблiснуць і тут сваім прарочым провідам, у прыватнасці — у апавяданні «Гарнізон». Значыць, напрыканцы 60-х тры прапаршчыкі атрымалі кватэры: два расейскія і адзін украінскі, у якога Зянон-аспірант нейкі час здымаў закутак. У аднаго расейца быў ручны голуб, у другога — звычайны кот, а ўкраінец меў канарэйку. Дык вось, аднойчы кот нахабна з'еў голуба. Гаспадар птушкі вылавіў ката і, абвязаўшы таго дротам, прапусціў праз яго электрычны ток... Распачалася варажнеча... І вось як да таго паставіўся ўкраінец, распавёўшы пра тое аўтару праз некаторы час пры выпадковай сустрэчы ў горадзе:

«— Вы маглі б пра такое падумаць! — закончыў расповед Пеця. — У нас ва Украіне такіх ідыётаў шчэ няма.

— Вось бачыш, Пятро, а ўсё з-за любові да брацціяў нашых меншых.

— Добра, шчо воны так людэй нэ любяць, отжэ парэзалі б ужэ.

— А кенар жыве?

— Жыве, спявае».

Аповед жа «Геранім», бадай, не саступіць у мастацкім плане творам шмат якіх нашых вядомых празаікаў. Зянон Станіслававіч таленавіты не толькі ў палітыцы.

Не без цяжкасці ўспрынялася мной вандроўна-захапляльная карціна свету ў тэкстах-спарышах **Яраслава Ананкі і Генрыха Кіршбаума.** Двайное аўтарства разбівае цэльны вобраз паэта, як самастойнага творцы і асобы... Зрэшты...

Лірычна-«прышвінскія» запісы **Паўла Ляхновіча** дзіўна-трывожныя. Прырода зямная і прырода чалавечая тут сыходзяцца наўстыч... Паляўнічае і жыццядайнае шукаюць згубленую гармонію суіснавання ў гэтым свеце.

«...у небе над Гальцамі павольна і паважна круціўся тарнада з буслоў. Іх было — тысячы! (...) Уладзімер Арлоў, той самы, з тварам ляснога разбойніка, закінуўшы галаву, цікаваў за імі і твар яго мякчэў, і на ім праступіла душа дзіцяці. Калі ўсе буслы нарэшце заслізнулі за далягляд, сказаў з уздыхам:

— А крылы ў іх не белыя... чорнага больш. Але назва «Зямля пад чорнымі крыламі» была б як вырак. А ён дабраслаўляў...

Наша вандроўка была прысвечана памяці Караткевіча».

Вершы **Вікі Трэнас** з кожнай новай публікацыяй набываюць усё больш глыбокі сэнс і выяўляюць неадназначную вобразна-мастацкую натуру аўтара.

Калі ты не расчараваўся і выжыў,
хаця беглі па тваім следзе выжлы;
калі, гледзячы ў вочы ваўчысе,
дараваць навучыўся;
ведай, зменіцца ўсё, што
хуткаплынна...

Запісы **Уладзіміра Сіўчыкава** вызначаюцца прастатой стылю і анекдатычнасцю бытавых і жыццёвых сітуацый. Чытаць іх лёгка, забываць — таксама...

Вершы **Арыі-Ульрыкі Гатальскай** — нервовыя і імпульсныя — вытрыманыя ў адзіным ідэйным ключы айчыннай заклапочанасці:

Скрыжаваныя ў гэтай зямлі
Два пачаткі спрадвечнай веры:
Колер чырвоны — колер крыві,
Колер белы — колер паперы.

Разважныя рэчаісныя аповеды **Міколы Ільючыка** напісаныя нібыта на затрыманым дыханні... трывогі і спадзявання... Ім, на мой погляд, не хапае збою рытмікі ў пачуццях і разважаннях, спробы вырвацца з зачараванага кола людской будзённасці...

Ад прачытання вершаў **Алеся Плоткі** застаецца няўцямнае ўражанне аўтарскай ленаватай апломбнасці, недапрацаванасці, аляпаватасці, у рэшце рэшт, пакінутасці тэкстаў у іх першасным істотна-душэўным зародку... Аднак маюцца відавочныя ўдачы і праступае адценак таленту, хоць наноснае і прэтэнцыёзна-правакацыйнае ўсё ж пераважае:

гэта зусім і не вершы,
я прэтэнзій ніякіх не маю
лепшы не той, хто першы,
лепшы той, хто маўчыць і знае...

І ўжо на самым ускрайку нізкі, відаць, мне як аглядальніку, ці яшчэ якому няшчаснаму крытыку, Алесь пакідае свой аўтарскі грымлівы «завет»:

пацалуй мяне ў тастамент,
прыдурак!
напішы за мяне на цэгле
мае творы — не твой завулак,
бяры матор і валі адсюль!

Як казаў класік: «Ён палохае, а мне не страшна». Адным словам, да Сыса яшчэ далёка, але ёсць зайздросная энергетыка. Шлях абраны, трэба яго адольваць...

Нешта сваё, неардынарнае ёсць і ў мысленні і міфалагічна-паганскіх вобразных карцінах большасці вершаў дэбютанта **Дзмітрыя Лавіцкага:**

Але ты ведаеш: іншыя птушкі
ў лесе
глядзяць на яго з нянавісцю
і праклёнам,
і ён хаваецца, ён не спявае песень
і выгукае цемру замест імёнаў.

Аднак яшчэ шмат сырога і няўцямнага як у філалагічным, так і ў філасофскім аспекце яго твораў.

Пэўна будзе цікавым некаторым чытачам часопіса і пераклад з ангельскай мовы паэмы «Кашмар на Каляды» вядомага кінарэжысёра **Тыма Бертана,** зроблены Максімам Шчурам (дарэчы, з досведнай прамовай перакладчыка).

У гэтым жа шэрагу і публікацыя сучаснай літоўскай паэзіі, да перастварэння якой спрычыніліся А. Адамовіч, У. Арлоў, А. Башарымава, В. Рыжкоў і А. Хадановіч.

Вытрымкі з перагледжаных хатніх архіваў, якія прапануе **Ніл Гілевіч,** тым не менш, нярэдка выклікаюць здзіўленне асобнымі невядомымі праявамі літаратурнага працэсу пасляваеннай пары (1947–1949 гг.). І напраўду, вялікае бачна на аддаленні, а дробнае — пры блізкім і карпатлівым разглядзе... Асабліва цікава прасачыць за тагачаснай літаратурна-крытычнай творчасцю А. Куляшова, П. Панчанкі і А. Кучара...

Асноўны тэмат творчасці пісьменніка **Анатоля Бутэвіча** цесна зніітаваны з гісторыяй Беларусі. І калі яго мастацкая проза пераважна напісаная на архіўна-дакументальных матэрыялах, то прапанаваны часопісам публіцыстычна-культурніцкі артыкул падае толькі яго развагу (рэфлексію), заснаваную на крэўным (кроўна-радавым) спасціжэнні вялікай гісторыі свайго народа. Ён піша:

«...нам проста конча трэба поўнааб'ёмна ведаць сваё мінулае, як і належыць кожнай еўрапейскай нацыі. Ведаць глыбінна, без выняткаў і выкрэсліванняў. Не выбарачна на карысць любых па часе нашага жыцця ідэалагем. І тады ў гэтым разумным паяднанні з'явіцца яшчэ адна магчымасць зразумець: хто мы, дзеля чаго мы, які наш лёс і сэнс жыцця на гэтай зямлі».

Поруч друкуецца даволі аб'ёмны артыкул **Алеся Бяляцкага** «У смерці ўсе роўныя». Як даследчык літаратуры, аўтар праходзіць па «беларускіх слядах» вядомага твора рускага пісьменніка Анатоля Рыбакова «Важкі пясок». А. Бяляцкі рэпрэзентуе беларускія фрагменты, не адасабляючы іх ад усяго кантэксту рамана, і, аналізуючы іх вобразныя выявы, *вычытвае* аўтарскі агульначалавечы гуманізм, што праяўляецца падчас вялікіх гістарычных катаклізмаў. Чытаючы гэта, напісанае А. Бяляцкім у цяжкіх турэмных умовах, даводзіцца толькі па-зайздроснаму здзіўляцца фізічнай і валявой моцы характара зняволенага ды заадно жадаць яму да канца годна пераадолець абрынуты на яго вырак.


Даволі пазнавальна выпісала творчы партрэт вядомага і таленавітага пісьменніка А. Федарэнкі ў звязку з яго пяцідзесяцігоддзем крытык **Лада Алейнік.** Не менш уражлівы партрэт свайго даўняга сябра Сяргея Іванова выпісаў і паэт **Славамір Адамовіч.** Гэта тэкст пра беларуса, які ў пэўным сэнсе так і не стаў самадастатковым Чалавекам, а яшчэ пра тое даўняе-пракаветнае (купалаўскае) жаданне «людзьмі звацца»...

Публікуецца артыкул памяці трагічна загінулага Сержука Маціна, з любоўю напісаны **Людмілай Рублеўскай.** Таксама змешчана нізка лепшых вершаў маладога паэта.

Напрыканцы часопіса — арыгінальная рэцэнзія-эсэ на кніжку «люстрацый» А. Лукашука «Зкімбы-зымбы» ўжо вядомага крытыка **Ціхана Чарнякевіча.**

А яшчэ анансуюцца новыя кніжкі ды падаецца змест часопіса за прамінулы (2013) год.

Прыемнага чытання.



Зборнік пра Еўрамайдан

Ва Украіне выйшла кніга «Еўрамайдан. Хроніка пачуццяў».

Шасцёра ўкраінскіх пісьменнікаў прадставілі зборнік пра масавую шматмесячную акцыю пратэсту ў Кіеве. Сяргей Жадан, Тарас Прахасько, Юры Андруховіч, Іван Цыпердзюк, Юры Вынныччук і Васіль Карпюк стварылі серыю эсэ, якія адлюстроўваюць іх рэакцыю на тую ці іншую падзею, што адбылася ва ўкраінскай сталіцы ў апошнія месяцы. Напрыканцы кнігі «Еўрамайдан. Хроніка пачуццяў» прыведзена храналогія асноўных этапаў Еўрамайдана, якая дапамагае прасачыць, як разгортваўся грамадзянскі пратэст.

Укладальнікі зборніка адзначаюць, што тэксты пісаліся з канца лістапада 2013 года, з першых дзён акцыі. Шэраг эсэ быў апублікаваны ва ўкраінскіх перыядычных выданнях.

У якасці ідэі для вокладкі была абрана канцэпцыя, прапанаваная Аксанай Клёцкай. На фота дзяўчына з завязанымі вачыма (мадэль Іванна Берчак) чырвонай ніткай зашывае ўкраінскі нацыянальны сцяг. Па словах дызайнера вокладкі Мікалая Шкварока, ідэя сімвалізуе незалежнасць і цэласнасць Украіны ў любых акалічнасцях.

ЛІТКАЛЕЙДАСКОП

Юбілей расійскага кнігадрукавання

450 гадоў назад у Маскве выйшла першая друкаваная кніга «Апостал». Наказам Івана Жахлівага і пры дабраславенні мітрапаліта Макарыя 10 сакавіка 1564 года ў маскоўскай друкарні ліцвінаў-беларусаў Івана Федаровіча (Фёдарава) і Пятра Мсціслаўца выйшла першая ў Расіі друкаваная кніга «Апостал».

«Апостал» зміяшчае першыя ўзоры тлумачэння Святога Пісання вучнямі Ісуса Хрыста. Кніга стала ўзорам, які выкарыстоўваўся ў падрыхтоўцы наступных выданняў. Сама ж кніга стваралася амаль год: для яе трэба было не толькі падрыхтаваць тэкст, але і зрабіць абсталяванне, выліць шрыфты, набраць старонкі; у рэдагаванні кнігі мітрапаліт Макарый браў удзел асабіста. У выніку атрымалася кніга, выканаааная на прафесійным узроўні і высока адзначаная друкарамі з краін Еўропы.

Дарэчы, менавіта гэтае «трафейнае» выданне было выяўлена на дачы экс-прэзідэнта Украіны В. Януковіча ў Міжгор'і...

Невядомы Жукоўскі

Навукоўцы філалагічнага факультэта Томскага дзяржаўнага ўніверсітэта знайшлі 300 раней невядомых тэкстаў Васілія Жукоўскага (1783–1852).



В. Жукоўскі — класік расійскай паэзіі. Нарадзіўся ў Бялёўскім уездзе Тульскай губерні Расіі, «пабочны» сын тульскага памешчыка Буніна і палоннай турчанкі, які атрымаў прозвішча свайго «хроснага» — шляхціча-беларуса. В. Жукоўскі — аўтар першага афіцыйнага гімна Расіі «Молитва русских», «настаўнік» імператара Аляксандра II.

Даследнікі творчасці В. Жукоўскага на працягу 15 гадоў займаюцца выданнем тамоў поўнага Збора твораў паэта. За гэты час філолагі знайшлі каля 300 тэкстаў, раней невядомых шырокай грамадскасці.

Выданне поўнага Збора твораў В. Жукоўскага, якім цяпер займаюцца на філалагічным факультэце ТДУ, стане першай спробай сабраць разам усю творчую спадчыну паэта і перакладчыка. З 20 запланаваных тамоў ужо выдадзена 14.

«У розных гарадах свету існуе каля 15 архіваў Васіля Жукоўскага, кожны з якіх мы павінны былі вывучыць. У гэтых архівах мы знайшлі каля 300 новых тэкстаў В. Жукоўскага, якія ўключылі ў Збор твораў», — паведаміў загадчык кафедры расійскай і замежнай літаратуры ТДУ Аляксандр Янушкевіч.

Старонка падрыхтавана паводле матэрыялаў www.novostiliteratury.ru, Agence France-Presse, espreso.tv, www.vsiknygy.net.ua/news, lenta.ru, РІА «Новости», www.dw.de.

«Змагаймася за Украіну!»

Кіеўскія пісьменнікі заклікаюць улады Украіны адстойваць незалежнасць і адзінства дзяржавы. Пра гэта гаворыцца ў заяве Кіеўскай арганізацыі Нацыянальнага саюза пісьменнікаў Украіны на старонцы ў «Facebook» кіраўніка філіі Міхайлы Сідаржэўскага.



«У гэты незвычайна трывожны для Украіны час сталічныя пісьменнікі звяртаюцца да прадстаўнікоў улады, да патрыётаў, да ўсіх нераўнадушных грамадзянаў нашай краіны! Мы не хочам, мы адмаўляемся верыць, што можа стацца непапраўнае... Мы звяртаемся да вышэйшага заканадаўчага органа дзяржавы — Вярхоўнай Рады: не маўчы! Скажы сваё цвёрдае і адзінагалоснае слова пра недапушчальнасць агрэсіі і гатоўнасць супрацьстаяць акупацыі ўкраінскай зямлі! Народ і армія павінны пачуць голас вышэйшага кіраўніцтва дзяржавы», — гаворыцца ў заяве.

Паводле яе аўтараў, выключна важную ролю сёння мусяць адыгрываць сродкі масавай інфармацыі. «У гэты трывожны час усе ўкраінскія СМІ павінны праявіць сваю высокую грамадзянскую свядомасць і максімальна інфармаваць насельніцтва пра становішча ў Крыме і ў іншых рэгіёнах Украіны, дзе існуе пагроза для ўкраінскай дзяржаўнасці», — заклікае Кіеўскае аддзяленне НСПУ. Кіеўскія пісьменнікі звяртаюцца да лідэраў палітычных партый, грамадскіх і творчых арганізацый, украінскіх цэркваў з заклікам выкарыстоўваць усе магчымасці для гуртавання ўкраінцаў.

«Змагаймася за Украіну! Змагаймася за мірную і суверэнную будучыню нашых дзяцей і ўнукаў! Усімі магчымымі — пакуль што мірнымі — спосабамі!», — просяць украінскія творцы.

Вядома, што палітыка Расіі адносна Украіны (і, у прыватнасці, Крыма) рэзка крытыкуецца міжнароднай супольнасцю. ЕС і ЗША прыстрашылі Расію санкцыямі. Украіна, ЕС і ЗША заявілі, што не прызнаюць законнымі вынікі рэферэндума па ўваходжанні Крыма ў склад Расійскай Федэрацыі.

Сваю падтрымку незалежнай і дэмакратычнай Украіны і яе творцаў напрацягу апошніх месяцаў неаднаразова ў сваіх заявах выказвалі сакратарыят і Рада Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Каля ста дзеячаў навукі, мастацтва і культуры Беларусі (сярод іх — Уладзімір Арлоў, Зінаіда Бандарэнка, Лявон Баршчэўскі, Анатоль Вярцінскі, Радзім Гарэцкі, Валянцін Голубеў, Віктар Дашук, Валянцін Жданко, Сяргей Законнікаў, Святлана Калінкіна, Аляксей Кароль, Ігар Кузняцоў, Аляксей Марачкін, Уладзімір Някляеў, Алесь Пашкевіч, Пётра Садоўскі, Міхась Скобла, Юры Хашчавацкі, Віктар Шалкевіч) 14 сакавіка падпісалі зварот у падтрымку Украіны.

«Мы рашуча асуджаем усе спробы дзяліць Украіну па этнічным прынцыпе і выступаем за мірнае вырашэнне праблемаў унутры краіны самімі грамадзянамі Украіны ў рамках закона, — гаворыцца ў звароце. — Для нас, беларусаў, Харкаў, Данецк, Сімферопаль, Адэса — гэта такія ж украінскія гарады, як Львоў, Луцк, Чарнаўцы і Палтава. Украіна павінна захаваць у межах, якія замацаваліся за ёй з моманту падпісання Белавежскіх пагадненняў.

Мы з вамі, мы — за непадзельную Украіну, мы — за незалежную еўрапейскую Украіну, будучыню якой мае права вырашаць толькі яе народ».

Тым часам дзеячы культуры і мастацтваў Расіі выказвалі зусім іншыя думкі. Так, Саюз пісьменнікаў Расіі звярнуўся з адкрытым лістом да прэзідэнта Уладзіміра Пуціна і Федэральнага Сходу, канстатуючы падтрымку дзеянняў расійскіх уладаў адносна сітуацыі ва Украіне. У тэксце ліста ў «лепшых савецкіх стылістычных і лексічных традыцыях» гаворыцца аб тым, што «дэструктыўныя сілы Захаду», здзейсніўшы «дзяржаўны пераварот» ва Украіне, перайшлі ў наступ на галоўны маральны вынік другой сусветнай вайны — на забарону і асуджэнне фашызму і нацызму.

На думку падпісантаў, новыя ўлады ў Кіеве сёння заняты не забеспячэннем правапарадку і бяспекі грамадзянаў, а «забаронай рускай мовы» і пераследам рускамоўных. «Гэта значыць, што хутка, як у Трэцім рэйху, запалаюць кнігі вялікіх прадстаўнікоў сусветнай літаратуры», — безапеляцыйна гаворыцца ў тэксце.

Пад лістом ад 6 сакавіка значацца, між іншых, прозвішчы вядомых расійскіх пісьменнікаў Юрыя Бондарава, Валянціна Распуціна, Уладзіміра Крупіна, Валерыя Ганічава, Станіслава Куняева.

За расійскімі літаратарамі паставілі свае подпісы пад лістом «У падтрымку пазіцыі прэзідэнта па Украіне і Крыме» і 85 расійскіх акцёраў, спевакоў і кінарэжысёраў. Сярод іх Аляксей Баталаў, Сяргей Бязрукаў, Міхаіл Баярскі, Алег Табакоў, Васілій Ланавой, Генадзій Хазанаў, Алег Газманаў, Фёдар Бандарчук, Станіслаў Гаварухін, Павел Лунгін, Зураб Цэрэтэлі, Мікалай Цыскарыдзэ, дырыжоры Юрый Башмет і Уладзімір Співакоў.

«У дні, калі вырашаецца лёс Крыму і нашых суайчыннікаў, дзеячы культуры Расіі не могуць быць абыякавымі назіральнікамі з халодным сэрцам. Наша агульная гісторыя і агульныя карані, наша культура і яе духоўныя вытокі, нашы фундаментальныя каштоўнасці і мова аб'ядналі нас назаўжды. Мы хочам, каб агульнасць нашых народаў і нашых культур мела трывалую будучыню. Вось чаму мы цвёрда заяўляем пра падтрымку пазіцыі Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі па Украіне і Крыме», — гаворыцца ў звароце.

Афіцыйная расійская пазіцыя была агучана вуснамі міністра замежных спраў Лаўрова: Крым для Расіі — больш, чым Каморскія астравы для Францыі і Фалкленды для Брытаніі. Маўляў, у 1783 годзе Екацярына II апублікавала маніфест аб прыняцці ў склад імперыі «паўвострава Крымскага». А што ж сказаць нашчадкам кімерыйцаў, таўраў, скіфаў, старажытных грэкаў, караімаў, генуэзцаў, залатаардынцаў, туркаў, якім стагоддзямі да расійска-імперскіх заваёўнікаў належала тая зямля і вада вакол яе? Зрэшты, факт застаецца фактам: Крымскае ханства стварыў Вітаўт, а таму, па «лаўроўскай» логіцы, нашчадкам ВКЛ таксама ёсць на што квапіцца...

Аднак не ўсе расійскія творцы хочуць вайны. Празаік Барыс Акунін жорстка раскрытыкаваў улады сваёй краіны і прэзідэнта Пуціна за ўварванне ва Украіну. Ёсць і тыя, хто выходзіць на акцыі пратэсту. Але плакаты «Не — вайне!» цяпер у Расіі па-за законам, за такія лозунгі выносяцца адміністрацыйныя суды. Як, зрэшты, і ў Беларусі...

Між тым у сацыяльных сетках гуляе такі жарт: «І ў страшным сне Гітлеру ў 45-м не магло прысніцца, што канцлер Германіі будзе ўгаворваць Расію не нападаць на Украіну»...

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by